Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

„НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА ПРЫВАТНІКУ"

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 309 (4215)
Нядзеля, 15 лістапада
1931 г.

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ—Змагацца за высокую таварнасьць жывёлагадоўчых гаспадарак. (1 стар.). Праф. НАЙДЗЕНАЎ—За малочную карову. (2 стар.). Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ—Літаратурныя нататкі (3 стар.).

АБ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ—Пастанова бюро ЦК КП(б)Б (ад 10 лістапада 1931 г.) (1 стар.).

Любаньскі раён, Магілеўская і Гарадоцкая МТС выканалі плян зяблева (1 стар.).

МТС БССР павінны заваяваць канчатковую перамогу на збожжазагатоўчым фронце (1 стар.).

Павысіць ролю сельпарткомаў, разьвіць іх работу—адна з цэнтральных задач справаздачна-перавыбарчай кампаніі. (2 стар.).

Па-бальшавіцку змагацца за якасьць (3 стар.).

У фэрмах 10 раёнаў не пастаўлена ніводнага цяляці. (3 стар.).

Па СССР і БССР (4 стар.).

КІТАЙ: Падрыхтоўка правакацыйнага выступленьня супроць СССР (4 стар.).

Змагацца за высокую таварнасьць жывёлагадоўчых гаспадарак

Сьледам за тым, як партыя з посьпехам вырашыла асноўную збожжавую праблему, перад намі паўстала на чаргу задача па вырашэньні праблемы жывёлагадоўлі. З дня апублікаваньня гістарычнай адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК аб жывёлагадоўлі прайшло ўжо больш трох месяцаў. Гэта адозва зьявілася баявой праграмай будаўніцтва сацыялістычных фабрык мяса і малака зусім на новай базе, на базе разгортваньня будаўніцтва саўгасаў і калгасаў, на базе арганізацыйнага ўмацаваньня калгасаў.

Ужо праробленая намі работа цалкам пацьвярджае сказанае ў адозве аб тым, «што ў асобе калгасных таварных фэрм і інкубатарных птушніцкіх станцый знойдзена форма стварэньня аграмаднага жывёлагадоўлі і птушніцтва, найбольш адпаведная сучаснай арцельнай стадыі калгаснай гаспадаркі і побач з саўгасамі найбольш хутка вырашаючая задачу стварэньня буйной жывёлагадоўлі».

У процівагу разважаньням «правых» апартуністаў, якія бралі стаўку на будаўніцтва кулацкіх гаспадарак, калектывізаванае сялянства і работы саўгасаў пад кіраўніцтвам партыі ўзяліся за практычнае ажыцьцяўленьне баявога клічу ЦК УсеКП(б) і набліся вялізарных посьпехаў.

Калі па 1-га кастрычніка мінулага году па сацсэктары БССР мы мелі агульную колькасьць рагатай жывёлы 199.700 штук, дык на 1-га лістапада г. г. усё стада рагатай жывёлы складае 673.000 штук. Саўгасы за гэты перыяд павялічылі сваё стада з 38.000 да 75.000, па калгасах і МТФ мы маем павялічэньне з 161.800 да 597.700 штук. Расьце непарыўна і стада прадукцыйнай жывёлы па МТФ, якія маюць 124.000 штук з іх 78.000 дойных кароў. Такім чынам [illegible] выканалі заданьне партыі і ўраду па камплектаваньні прадукцыйнай жывёлы. Свіное стада за 13 месяцаў вырасла з 84.000 да [illegible].000 штук, у ліку якіх ёсьць [illegible].500 сьвіноматак. Арганізаваныя [illegible] жывёлагадоўчыя саўгасы, з іх 86 спэцыялізаваных сьвінагадоўчых, 1.018 малочных фэрм і 1.100 калгасных таварных фэрм, зьяўляюцца тым фундамантам, на базе якога мы забясьпечым далейшае прасоўваньне наперад і канчаткова вырашым праблему жывёлагадоўлі.

Усё-ж гэтыя дасягненьні ні ў якім выпадку ня могуць нас задаволіць. Рост пралетарыяту і пабудова новых фабрык і заводаў-гігантаў патрабуюць ад нас працаваць яшчэ большымі тэмпамі, каб цалкам забясьпечыць патрэбы працоўнага насельніцтва. За выключэньнем МТФ, якія датэрмінова выканалі плян камплектаваньня на 100 проц., па іншых паказальніках мы маем значнае адставаньне. Фэрмы па гадоўлі маладняка ўкамплектаваны ўсяго на 17,6 проц. Па сыстэме саўгасаў камплектаваньне рагатай жывёлы выканана каля 80 проц. СТКФ—на 56,2 проц. і г. д. Такім чынам нам прадстаіць яшчэ вялікая работа, каб да першага студзеня поўнасьцю выканаць плян 1931 году.

Побач з дасягненьнямі ў рабоце па арганізацыі СТКФ і фэрм па гадоўлі маладняка нельга моўчкі абыйсьці той факт, што пры наяўным стадзе жывёлы мы не атрымліваем яшчэ тэй прадукцыйнасьці, якую яно можа даць. Павялічэньне прадукцыйнасьці жывёлы і таварнасьці жывёлагадоўчых гаспадарак зьяўляецца аднэй з першачарговых задач.

Нізкая прадукцыйнасьць жывёлы бязумоўна ёсьць рэзультат таго, што пытаньні зоатэхнікі, барацьба за павялічэньне ўдойнасьці кароў і павялічэньне таварнага выхаду па СТКФ з боку некаторых калгасаў і гаспадарнікаў саўгасаў ігнаруюцца. Ліквідацыя абязьлічкі, барацьба са стратамі і эпізоатыямі, увядзеньня зьвэлыпчыны і гаспадарчага разрахунку яшчэ ня сталі асноўнымі сродкамі барацьбы за якасьць.

Як правіла, у большасьці саўгасаў і калгасаў сьвінар і скотнік не зьяўляюцца яшчэ цэнтральнай фігурай, ад якое ў значнай ступені залежыць пасьпяховая работа па разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі. На пасаду сьвінара і скотніка вылучаюцца ня лепшыя калгаснікі, а часта горшыя. Частая зьмена сьвінароў і скотнікаў прыводзіць да абязьлічкі стада, якое яны абслугоўваюць. У выніку пагоршваецца догляд яго, паніжаецца прадукцыйнасьць і таварнасьць. Ураўнілаўка ў аплаце рабочых саўгасаў і ацэнцы работы калгасьнікаў яшчэ мае месца і спрыяе цякучасьці сярод абслугоўваючага пэрсаналу.

Таксама недаацэньваецца работа па паляпшэньні стада ў жывёлагадоўчых гаспадарках. Пытаньню адбору і мэтызацыі скаціны аддаецца надзвычай мала ўвагі. Адбор племянных вытворцаў, арганізацыя пунктаў штучнага апладненьня і арганізаванае правядзеньне злучной кампаніі—усе гэтыя мерапрыемствы павінны быць праведзены вры поўным падтрыманьні савецкай грамадзкасьці і мабілізацыі агратэхнічнага пэрсаналу. Толькі поўнае ўжываньне зоатэхнікі і культурнае вядзеньне гаспадаркі дадуць магчымасьць з посьпехам весьці барацьбу за павышэньне прадукцыйнасьці скаціны і рост таварнасьці ў жывёлагадоўчых гаспадарках.

Чаго варты такі факт, што ў рэзультаце таго, што злучная кампанія праходзіла самацёкам і без належнай падрыхтоўкі, ялавасьць сярод рагатай скаціны дасягае 10-12 проц., а па сьвіным стадзе—да 25-30 проц. Многія арганізацыі ня ўлічылі, што злучная кампанія павінна распэньвацца, як адна з першачарговых задач, як пасеўная і ўборачная.

Павышэньне таварнасьці МТФ і СТКФ таксама ня можа быць дасягнута, калі да пытаньняў камплектаваньня будзем адносіцца няўважліва. Карлікавыя фэрмы ня могуць даць належнага эфэкту. Кожная арганізаваная фэрма павінна зараз-жа ўкамплектоўвацца. Наша задача заключаецца ў тым, каб у бліжэйшы час у кожнай МТФ было пастаўлена ня менш 50 прадукцыйных кароў і ў СКТФ—ня менш 100 штук сьвінаматак.

Ход падрыхтоўкі да зімоўкі паказвае, што ў некаторых мясцох мы стаім перад пагрозай паўтарэньня леташніх недахопаў. На сёньняшні дзень частка скаціны яшчэ не забясьпечана належнымі памяшканьнямі, а існуючыя памяшканьні не рамантуюцца і не ацяпляюцца. На саўгасах Белсельтрэсту з 80 абор побудавана толькі 16 і распачата 55, з 39 цялятнікаў пабудавана 7 і пачата 25. Такі-ж малюнак і па другіх сыстэмах. Меры прафілактычнага характару ў барацьбе з эпізоатыямі таксама ня выконваюцца. Факты, якія мы маем, гавораць, што апартуністычная практыка, недаацэнка арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, недаацэнка важнасьці барацьбы за якасьць вядзе да паўтарэньня леташняй гісторыі, калі скаціна знаходзілася пад адкрытым небам, што спрыяла павялічэньню ўпадку.

Сілаасаваньне пакуль што выканана толькі на 38,4 проц. Такім чынам мы сустракаем зіму са значным недавыкапаньнем пляну і дэфіцытам па сакавітых кармох.

Недавыкананьне пляну здачы прадуктаў жывёлагадоўлі (па малочных здана 41,7 проц. пляну, а па мясных —20,7 проц.) сьведчыць, што ў радзе калгасаў і сярод некаторых работнікаў саўгасаў ёсьць рвацкія спажывецкія тэндэнцыі. Факты-ж разбазараваньня таварнай прадукцыі паказваюць што барацьба з гэтымі тэндэнцыямі не праводзіцца яшчэ належным чынам.

Усе гэтыя недахопы зьяўляюцца значнымі тормазамі ў разьвіцьці жывёлагадоўлі і асабліва тармозяць рост таварнасьці жывёлагадоўчых гаспадарак. Зьнішчэньне гэтых недахопаў патрабуе рашучай перабудовы работы па-новаму пад кутом рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна. Усякае супраціўленьне ліквідацыі абязьлічкі і ўраўнілаўкі, нежаданьне ўводзіць гаспадарчы разрахунак і ўкараняць зьдзельшчыну, пагардлівыя адносіны да рэалізацыі ўнутраных кармовых рэсурсаў і разбазарваньне іх—павінны разглядацца, як дапамога кулаку, што вядзе да падрыву арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Умацоўваючы арганізацыйна і гаспадарча калгасы, мы зможам падняць на патрэбную нам вышыню таварнасьць і прадукцыйнасьць сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Задача ўсіх раённых арганізацый і ячэек—паставіць справу так, каб кожны камуніст-гаспадарнік, рабочы саўгасу і калгасьнік несьлі адказнасьць у партыйным парадку за даручаную ім работу, служылі прыкладам усёй масе работнікаў, якія абслугоўваюць жывёлу. Мабілізаваць масы калгасьнікаў і рабочых саўгасаў на поўнае выкананьне пляну жывёлагадоўлі 1931 г., камплектаваньне [illegible] тым годзе «павінен быць закладзен цьвёрды фундамант для далейшага шпаркага разьвіцьця сацыялістычнага сэктару жывёлагадоўлі» (ЦК УсеКП(б).

Адначасова з разгортваньнем узмоцненай работы па арганізацыі і камплектаваньні МТФ, СТКФ і жывёлагадоўчых саўгасаў, мы павінны весьці самую рашучую барацьбу з недаацэнкай разьвіцьця такіх галін, як птушніцтва, трусагадоўля і аўцагадоўля, прадукцыя якіх займае значнае месца ў агульным пляне прадуктаў жывёлагадоўлі. Ня трэба забываць таго, што ў 1932 годзе Птушкакалгаспэнтр і Белпітушкапрадукт павінны здаць 4.010 цэнтнэраў мяса і 2.850.000 штук яек. Даныя галіны патрабуюць належнай увагі і ўдзелу ўсёй грамадзкасьці ў арганізацыі і разгортваньні гэтай справы. Ня меншую ўвагу трэба аддаць і гадоўлі коняй, памятаючы, што конь яшчэ доўга будзе прыяцелем трактара і што пытаньні конскай цягі ня зьняты з парадку дня.

Толькі ў рашучай барацьбе з правай і «левай» практыкай, з апартуністамі, якія не жадаюць весьці работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, змагаючыся за якасьць у жывёлагадоўчых гаспадарках, пры актыўным удзеле ўсёй грамадзкасьці калгасаў і саўгасаў, мы вырашым праблему жывёлагадоўлі.

ЛЮБАНЬСКІ РАЁН, МАГІЛЕЎСКАЯ І ГАРАДОЦКАЯ МТС

ВЫКАНАЛІ ПЛЯН ЗЯБЛІВА

Раўняючыся па гэтых перадавікох, могуць і павінны дабіцца поўнай перамогі ўсе адстаючыя раёны

Зводка НКЗ БССР

аб ходзе зяблева ў раёнах (проц. выкананьня пляну)

ПАЎДНЕВАЯ ЗОНА		Чырвонапольскі	55,7	Смалявіцкі	38,5
Брагінскі	43,4	Чырвонаслабодзкі	71,9	Талачынскі	26,7
Буда-Кашалёўскі	29,4	Уваравіцкі	83,9	Чэрвеньскі	40,4
Бабруйскі	47	Хойніцкі	61,3	Чавускі	24,2
Веткаўск	26	**ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА**		Чэрыкаўскі	32,2
Глускі	53,9	Асіпавіцкі	45	Шклоўскі	28,7
Гомельскі	37	Быхаўскі	41	Вузьдзенскі	40,4
Жыткавіцкі	84,1	Барысаўскі	30,7	**ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА**	
Жлобінскі	25,9	Бялыніцкі	52,6	Асьвейскі	43,8
Кармянскі	43,6	Вягомльскі	35	Аршанскі	70,9
Камарынск	66,5	Варэзінскі	24,6	Вешанковіцкі	12,7
Ельскі	41,5	Горацкі	37,2	Віцебскі	52,2
Лоеўскі	40,5	Заслаўскі	54,4	Вушацкі	32
Любаньскі	98,8	Клімавіцкі	43,6	Гарадоцкі	26,7
Лельчыцкі	26,8	Крупскі	31	Дубровенскі	32,9
Мазырскі	49,3	Капыльскі	52,6	Дрысенскі	31,9
Нараўлянскі	26	Касьцюковіцкі	36	Лёзьнянскі	51,4
Парыцкі	44,5	Клічаўскі	61	Полацкі	58
Пятрыкоўскі	56,2	Койданаўскі	39	Лепельскі	53
Рагачоўскі	88,8	Крычаўскі	24,7	Расонскі	42,4
Рэчыцкі	27,8	Лагойскі	37,1	Суражскі	26,3
Слупкі	46,6	Магілеўскі	31	Сеньненскі	31,5
Старобінскі	41,5	Мсьціслаўскі	33,8	Сіроцінскі	39,4
Стара-Дарожскі	74,2	Менскі	48,8	Чашніцкі	21,7
Тураўскі	63,7	Прапойскі	25	На БССР	40,7
Церахаўскі	43,7	Пухавіцкі	53,9		
Чачэрскі	29,7	Плешчаніцкі	15,6		

***

Зруху ва ўздыме зяблева не дасягнута. Аб гэтым сьведчыць выкананьне БССР толькі 40,7 проц. пляну на 10 лістапада.

Узорана 677.413 га з 1.670.000 га. Наперадзе адзін Любаньскі раён (98 проц.). Каля дваццаці-ж раёнаў узарала менш трэці пляну.

Той факт, што саўгасы, абавязаныя паказаць узор барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці, выканалі 39 проц., калгасы—45,4 проц., а аднаасобнікі —35,3 проц. зяданьня, гаворыць аб тым, што адказнейшая кампанія не арганізавана сапраўды па-бальшавіку, не ўзначалена зямельна-калгаснай сыстэмай і партыйным кіраўніцтвам многіх раёнаў. Правільная арганізацыя працы на аснове зьдзельшчыны рэдка дзе пастаўлена на зяблеве. Вялізарная колькасьць снабодных коняй пасецца на лугах, адначае ў стайнях замест таго, каб працаваць на ворыве.

У яўна невыстарчальнай меры ўсё яшчэ скарыстоўваецца трактарная цяга, асабліва ў саўгасах, некаторыя кіраўнікі якіх злачынна ігнаруюць дырэктывы партыі аб зяблеве. Так, у сыстэму Белсаўгастрэсту «Заціша», «Сеньніца», «Каралёва» і «Новы Двор» яшчэ фактычна не прыступілі да ворыва.

Большасьць МТС не пераканала ўсяго трактарнага парку і не мабілізавала асноўнай масы калгасных коняй. У выніку—усе МТС выканалі плян усяго на 63,3 проц. Толькі Магілеўская і Гарадоцкая МТС ужо поўнасьцю справіліся са сваёй задачай. Трактары перакінуты імі на дапамогу адстаючым раёнам.

ЦК КП(б)Б паставіў баявую задачу перад усёй партарганізацыяй—ва што-б там ні стала поўнасьцю выканаць плян зяблева да наступленьня марозаў. Гэтую дырэктыву можна выканаць, калі арганізацыі ўсіх адстаючых раёнаў сапраўды павернуцца тварам да кампаніі, узьмімуць на гэтую справу масы, цьвёрда ажыцьцявяць намечаныя арганізацыйныя мерапрыемствы і павядуць самую рашучую барацьбу з апартуністычнымі настроямі аб бескарыснасьці ворыва.

Барацьба за зяблева—гэта барацьба на важнейшым вучастку арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Любаньскі раён, Магілеўская і Гарадоцкая МТС, сотні калгасаў і саўгасаў ужо перамаглі на гэтым вучастку. Раўняючыся па гэтых перадавікох, могуць і павінны дабіцца перамогі ўсе раёны БССР.

Трактары прастая[illegible] цэлы месяц

ЧАВУСЫ.

Чавускі раён ганебна адстаў у в[illegible] капаньні пляну зяблева. На 6 лістап[illegible] да выкапана 18 проц.

Вынікі апошняй шыціднеўкі не пак[illegible] ваюць зруху. Прырост складае: [illegible] калгасах — 8,5%, па аднаасобн[illegible] сэктары—3 проц. Такавы вынікі бяз[illegible] дзейнасьці раённых арганізацый [illegible] сельсаветаў, якія недаацэньваюць [illegible] літычнай важнасьці кампаніі. кампаніі.

На працягу кастрычніка ні райко[illegible] партыі, ні РВК пытаньнем зяблева [illegible] займаліся. Катэгарычная дырэктыв[illegible] партыі аб пераключэньні асноўнай м[illegible] сы цягавай сілы на ворыва ігнаруе[illegible] ца. Прысланыя 9 трактараў Чавуска[illegible] МТС цэлы месяц стаялі на станцы[illegible] Толькі 6 лістапада кіраўнікі МТС пер[illegible] вялі трактары са станцыі ў Чавусы.

Па радзе калгасаў зяблева зрыва[illegible] апартуністычная стаўка на чарго[illegible] васьць кампаніі. Так, калгасы імя Ст[illegible] ліна, «Савецкая Беларусь», «Чырвона[illegible] зорка» увесь час адкладаюць ворыва [illegible] скончэньня іншых гаспадарчых кампа[illegible] ній. Між тым, конская цягавая сіла н[illegible] скарыстоўваецца.

Трэба пасьпяшаць ўжыць рашучы[illegible] меры ўзьдзеяньня супроць канкрэтны[illegible] асоб, якія зрываюць важнейшую гас[illegible] падарча-палітычную справу.

Барысевіч.

Перакінуты ў адстаючыя раёны

Магілеўская і гарадоцкая МТС пер[illegible] шымі з усіх трактарных станцый вы[illegible] каналі плян зяблева. Гэтыя МТС пера[illegible] кінулі свае трактары на дапамогу а[illegible] стаючым раёнам. (БелТА).

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа—прыватніку"

МТС БССР ПАВІННЫ ЗАВАЯВАЦЬ КАНЧАТКОВУЮ ПЕРАМОГУ

НА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎЧЫМ ФРОНЦЕ

На перадавыя пазыцыі

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб загатоўках абавяваў упаўнаважанага Трактарацэнтру тав. Каршакевіча і старшыню Калгасцэнтра тав. Міцькова, «забясьпечыць масавую праверку калгасаў, згодна дырэктыў Трактарацэнтру і Калгасцэнтру СССР з тым, каб выкрыць усе скажэньні ў галіне загатовак і дабіцца ў максымальна скарочаныя тэрміны выкананьня калгасамі абавязкаў перад дзяржавай у першую чаргу».

Апошнія даныя аб ходзе збожжазагатовак на калгасах МТС паказваюць, што гэта дырэктыва ЦК КП(б)Б яшчэ ня выкапана. На 10 лістапада гадавы плян здачы збожжа на калгасах МТС акацьцёўлены ўсяго па 63,1%. Між тым, паводле дырэктывы партыі і ўраду, трэба было дабіцца выкананьня 65% гадавога пляну яшчэ да 1 лістапада. Калгасы МТС павінны былі ісьці ў авангардзе загатовак, паказваць сапраўды баявыя тэмпы здачы збожжа.

Перадавыя МТС, якія ўсьвядомілі ўсю важнасьць збожжазагатоўчай кампаніі, па-бальшавіцку ацанілі і ўразумелі новую абстаноўку, у якой праходзяць загатоўкі і неабходнасьць у сувязі з гэтым новых форм масава-палітычнай работы, дабіліся вялікіх перамог на фронце здачы збожжа дзяржаве. Церахаўская МТС па 10 лістапада выканала гадавы плян здачы збожжа на 120,2%, Аршанская—на 119,5%, Лепельская—на 110,2%, Мсьціслаўская—на 103,4%, Заслаўская—на 94,5 проц., Танеская—на 97 проц., Жыткавіцкая—на 93,4 проц.

Зусім іншы малюнак мы маем па тых МТС, якія з самага пачатку збожжазагатовак, асудзілі гэту кампанію на самацёк, не мабілізаваліся па арганізацыю бесьперабойнай канвэрнай здачы збожжа, не разгарнулі шырокай масава-палітычнай работы сярод калгасьнікаў. Да гэтых МТС адносяцца Боркавіцкая, якая выканала толькі 20,9% свайго гадавога заданьня, Ветрынская — 33,7%, Гарадоцкая — 28,5%, Семенская—39,3%, Старадарожская — 47,9%, Слуцкая — 43,8%, Менская — 37,1%, Магілеўская — 40,4% і г. д.

Матар'ялы, якія мы сёньня друкуем аб Капыльскай МТС, паказваюць, як ня трэба працаваць, як нельга весьці загатоўкі. Машыны скарыстоўваюцца вельмі дрэнна. З 15-ці трактарных малатарань працуюць толькі 6, а рэшта стаіць на складзе МТС. У выніку абмалот яшчэ ня скончаны, а гэта затрымлівае і здачу збожжа дзяржаве.

Такія-ж факты маюць месца і ў радзе іншых МТС, дзе таксама зацягваецца абмалот у выніку нескарыстоўваньня наяўнай колькасьці машын.

У бліжэйшыя-ж дні машына-трактарныя станцыі БССР павінны выйсьці на перадавыя пазыцыі збожжазагатоўчага фронту. На аснове шырокай масава-палітычнай работы, разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы — сацэнаборніцтва і ўдарніцтва, рашучай барацьбы з месьніцка-спажывецкімі тэндэнцыямі, арганізацыі калгасных мас на руйнуючы адпор кулацтву і яго агентуры, МТС БССР павінны дабіцца канчатковай перамогі на фронце здачы збожжа дзяржаве.

Брыгада Дому Калгасьніка ўзяла на буксір Клічаўскі раён

Цэнтральны Дом Сельніна, пасьля апублікаваньня пастановы ЦК КП(б)Б аб загатоўках, накіраваў спэцыяльную брыгаду ў Клічаўскі раён, які зьяўляецца адным з самых адсталых раёнаў па загатоўках. Брыгада дабілася пэўнага перапому ў ходзе загатовак.

За 11 дзён работы брыгада ахапіла тры сельсаветы — Валяўіцкі, Убалоцкі і Грыбавіцкі і 7 калгасаў. У выніку праведзенай шырокай масава-растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў аб значэньні своечасовай здачы збожжа дзяржаве, тэмпы здачы збожжа рашуча ўзьняліся. Процант выкананьня гадавога заданьня па гэтых сельсаветах павялічыўся з 13 да 70. Калгасьнікі і аднаасобнікі абавязаліся ў самы кароткі тэрмін поўнасьцю скончыць здачу збожжа.

Асабліва брыгадзе прышлося папрацаваць у калгасе «Пераможца», у яко[illegible] працэсьлі кулакі і заможнікі, з мэтай разбурыць калгас з сярэдзіны. У гэты[illegible] калгасе жыцьцё ня было абгулена, ус[illegible] бульба разьмерзвала на хатах, а ярав[illegible] вое збожжа захавана ў сьвірнах. Нікагд[illegible] ўліку працы ў калгасе ня было.

Кулацтва і яго агентура — правыя «левыя» апартуністы, якія вялі шалёную агітацыю супроць плянаў, крычал[illegible] аб іх нерэальнасьці, втрымалі руйнуючы адпор.

БУТОМАЎ.

Вынік баявой работы

БАБРУЙСК. (Наш кар).

На 10 лістапада Бабруйскі раён выканаў гадавы плян збожжазагатовак на 71,2 проц. Гэта вынік баявой работы перадавых сельсаветаў, якія па-бальшавіцку рэалізуюць дырэктывы партыі і ўраду аб загатоўках. Рад сельсаветаў ужо перавыканаў гадавыя заданьні па здачы збожжа дзяржаве. Так, МІХАЛЕЎСКІ сельсавет здаў 108,4 проц. гадавога пляну, БРОСКІ — 105,9 проц. і КАЗУЛІЦКІ — 105,7 проц.

У той-жа час частка сельсаветаў плацецца ў хвасьце кампаніі і зрываю заданьні. БАГУШЭЎСКІ, БЕРАСЬНЯНСКІ, ПАЎЛАВІЦКІ, МЫШКАВІЦКІ, ХАРЛАПАВІЦКІ і МАЛЬЛЕЎСКІ сельсаветы ня выканалі нават і паловы гадавых плянаў.

Значна адстае КАЛГАСНЫ СЭКТАР, які на 10 лістапада выканаў толькі 37,5 проц. пляну.

Бюро Бабруйскага райкому КП(б)Б пастанавіла ВЫКЛЮЧЫЦЬ З ПАРТЫІ І ЗЬНЯЦЬ З РАБОТЫ старшыню калгасу «Чырвоны Усход» АБРАЖЭЯ, які імкнуўся ашукаць партыю і ўрад—урваць ад дзяржавы як мага больш для сваіх месьніцкіх патрэб.

Старшыні БАГУШЭЎСКАГА сельсавету абвешчана суровая вымова. Разам з старшынь сельсавету, сакратароў ячэек і ўпаўнаважаных РК КП(б)Б зроблена папярэджаньне аб неабходнасьці дабіцца неадкладнага карэннага перапому ў ходзе збожжазагатоўчай кампаніі.

РАЙКАЛГАССАЮЗУ прапанавана забясьпечыць поўнае выкананьне калгасамі сваіх заданьняў па здачы збожжа не пазьней 20 постапада.

Райкому камсамолу прапанавана выпучыць ня менш 30 чалавек камсамольскага актыву, для дапамогі сельсаветам у правядзеньні загатовак на месцах.

А. МАГІДАЎ.

Аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

(ад 10 лістапада 1931)

1. Абгаварыўшы артыкул т. Давідзюка ў газэце «Правда» ад 28/IX 31 г., бюро ЦК КП(б)Б лічыць правільнай крытыку пастановы ЦК КП(б)Б ад 11 верасьня па пытаньнях калгаснага будаўніцтва па пунктах 3 і 4 гэтай пастановы, якія няправільна вызначалі задачу арганізацыйна-гаспадарчага будаўніцтва калгасаў для раёнаў, дасягнуўшых значных посьпехаў у тэмпах калектывізацыі і адстаючых.

2. Лічыць неабходным, у зьмену пастановы бюро ад 11/IX 31 г., унесьці на зацьвярджэньне пленуму ЦК КП(б)Б наступны тэкст пастановы:

«На падставе пастановы ЦК УсеКП(б) ад 2/VIII 31 г. аб тэмпах далейшай калектывізацыі і задачах умацаваньня калгасаў, пераглядзець пастанову ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б у тэй частцы, якая ставіць перад партарганізацыямі задачу — дабіцца вясной 1932 году ахопу 75 проц. сялянскіх гаспадарак і суцэльнай калектывізацыі да канца 1932 г.

У пытаньнях аб тэмпах калектывізацыі і далейшых задачах у калгасным руху кіравацца ўказаньнямі ЦК УсеКП(б), якія ўстанаўліваюць, што:

«Мярыпам заваяваньня ў асноўным калектывізацыі ўнутры ці іншага раёну ці галіны зьяўляецца неабходны ахоп усіх 100 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак з ахопам ня менш 75-80 проц. пасеўных плошчаў сялянскіх гаспадарак».

БССР, якая адносіцца па характары сельскай гаспадаркі да раёнаў спажываючай паласы, павінна вызначаць сваю работу ў галіне калгаснага руху, кіруючыся наступнымі ўказаньнямі ЦК УсеКП(б):

«У іншых раёнах СССР, у тым ліку і раёнах спажываючай паласы, ЦК прапануе весьці работу па калектывізацыі з такім разьлікам, каб у асноўным завяршыць калектывізацыю ў 1932-33 г.

ЦК асабліва перасьцерагае арганізацыі гэтых раёнаў і абласьцей ад пагоні за раздутымі процантамі калектывізацыі.

ЦК прапануе гэтым арганізацыям сканцэнтраваць увагу работнікаў на задачы паляпшэньня арганізацыйна-будаўнічай работы калгасаў і ўмацаваньня перш за ўсё ільняных і гародных раёнаў».

3. ЦК падкрэсьлівае, што партыйная арганізацыя яшчэ не пераключылася на вырашэньне па-бальшавіку асноўнай задачы, якая стаіць перад партарганізацыяй у калгасным будаўніцтве, — гэта на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў у іх сучаснай арцельнай форме. ЦК прапануе ўсім партыйным арганізацыям па-

Буйная перамога БССР на фронце сацыялістычнай жывёлагадоўлі

Заданьне па ўкамплектаваньні МТКФ выканана датэрмінова

БССР атрымала буйную перамогу на адным з важнейшых вучасткаў барацьбы за разгортваньне сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Плян камплектаваньня малочных таварных калгасных фэрм выканан датэрмінова. На 10 лістапада ў 1.100 МТКФ пастаўлена 78.091 дойная карова. Заданьне ўраду БССР выканана на 100,1%, а саюзнага ўраду — на 125,8%.

[illegible] ёпаў на выкананьне адозвы ЦК і СНК аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Такія раёны, як Лёзьнянскі — на 165%, Сіроцінскі — на 162%, Рэчыцкі — на 144%, Расонскі — на 142%, Жыткавіцкі—на 127%, Слуцкі — на 120%. У гэтых раёнах была шырока разгорнута ініцыятыва саміх калгасьнікаў.

Ня гледзячы на тое, што МТКФ існуюць першы год і перажываюць [illegible] Ёсьць, аднак, частка раёнаў, якія яшчэ не павярнуліся тварам да сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Такія раёны моцна адстаюць і ў справе камплектаваньня МТКФ: Карматнскі раён выканаў заданьне на 37,6%, Мазырскі—на 44,8%, Дрысенскі—на 47%, Уваравіцкі—на 52%, Чашніцкі—на 56%, Асьвейскі — на 58%, Пухавіцкі —на 59 проц., Віцебскі—на 60,7%

Важнейшая задача гэтых адстаючых раёнаў—раўняючыся па перадавых калгасьнікаў, гэту задачу можна і трэба выканаць.

Усе МТКФ Беларусі павінны зараз разгарнуць сапраўды бальшавіцкую барацьбу за якасьць, за ўзьняцьце прадукцыйнасьці буйной рагатай жывёлы, за падрыхтоўку да зімоўкі. Фарсаванае скончэньне будаўніцтва абораў і іх ацяпленьне, мабілізацыя ўнутраных кармавых рэсурсаў і іх эканомнае выдаткаваньне — важнейшыя зьвенні ў ланцугу мерапрыемстваў за ўзьняцьце прадукцыйнасьці за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ПАВЫСІЦЬ РОЛЮ СЕЛЬПАРТКОМАЎ, РАЗЬВІЦЬ ІХ РАБОТУ

АДНА З ЦЭНТРАЛЬНЫХ ЗАДАЧ ПЕРАВЫБАРАЎ ПАРТОРГАНАЎ

"НА АПОРНЫЯ ПУНКТЫ УСКЛАДАЕЦЦА ВЕЛЬМІ ВЯЛІКАЯ ЗАДАЧА, А ГАЛОЎНАЕ РАЙКОМЫ ПАВІННЫ ДАБІЦЦА, КАБ ГЭТЫЯ ПУНКТЫ СТАЛІ САПРАЎДЫ АПОРНЫМІ, КАБ ЯНЫ ЗАБЯСЬПЕЧЫЛІ НЕАБХОДНУЮ ДАПАМОГУ КАЛГАСНЫМ ЯЧЭЙКАМ“. *(ПОСТЫШАУ).*

Узор бальшавіцкай работы

Скараднянскі сельпартком (Ельскага раёну) абслугоўвае тры калгасныя ячэйкі. Апорная ячэйка знаходзіцца пры буйным калгасе **«Чырвоны трактар»**. Гэты калгас сьвінагадоўчы. Ен зьяўляецца сапраўды прыкладным па арганізацыі працы на аснове ўвядзеньня зьдзельшчыны, на камплектаваньні сьвінагадоўчай таварнай фэрмы і здачы таварнай прадукцыі дзяржаве.

Згодна ўмовы з Сьвінаводдэпэтрам калгас «Чырвоны трактар» павінен мець да канца бягучага году 75 сьвіноматак і таварных сьвіней 125 штук. На 20-га кастрычніка калгас меў ужо 66 сьвіноматак і 126 шт. таварных сьвіней. За ўвесь бягучы год калгас здаў дзяржаве сьвіней у агульнай вазе на 1120 клг.

Апорная ячэйка ў сваім складзе налічвае 9 членаў і 6 кандыдатаў партыі. Сельпартком, разгарнуўшы партыйную работу ў калгасах і сярод беднякоў і сераднякоў—адпаасобнікаў, дабіўся значных посьпехаў у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Скараднянскі сельсавет калектывізаваны на 87,8 проц. Засінцаўскі на 53,7 проц. Кармянскі на 72 проц. Кузьміцкі на 41,3 проц. **Усе калгасы пераведзены на зьдзельшчыну.** Па ўсіх калгасах пры разьмеркаваньні ўраджаю і выдачы авансу строга захоўваецца прынцып «хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае».

У наладжваньні вучоту працы, вялікае значэньне адыгралі курсы рахункаводаў, якія праведзены пры калгасе «Чырвоны трактар». Перадавыя калгаснікі «Чырвонага трактару» пасылаліся ў іншыя калгасы для дапамогі ў арганізацыі працы і ўвядзеньня зьдзельшчыны. У радзе калгасаў арганізаваны вытворчыя нарады.

Сельпартком мабілізаваў партыйныя ячэйкі калгасаў па арганізацыю загатовак. Калгасы Скараднянскага сельсавету выканалі загатоўчы плян па 94 проц., калгасы Засінцаўскага сельсавету — на 91,3 проц., Кармянскага—на 100 проц., і Кузьміцкага—на 144 проц. З посьпехам выканалі калгасы і пляны здачы гародніны.

Гэтых посьпехаў сельпартком дабіўся толькі таму, што **пытаньне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня паставіў у цэнтр ўвагі калгасных ячэек.** Камуністы-калгаснікі адыгрываюць сапраўды авангардную ролю і на вытворчай рабоце падаюць прыклад беспартыйным калгаснікам. Гэта ўсё павысіла аўтарытэт партыйных ячэек. За апошнія часы наглядаецца значны прыток заяў батракоў і лепшых калгаснікаў аб прыёме ў партыю. Толькі ў адну ячэйку калгасу «Чырвоны трактар» за 10 месяцаў падана 33 заявы.

Усе камуністы ахоплены партыйнай вучобай праз саўпартшколу і палітшколы.

Бязумоўна ў рабоце сельпарткому ёсьць і рад недахопаў. Першы і галоўны з іх заключаецца ў тым, што ў рэзультаце слабога кіраўніцтва сельсаветам апошні дапусьціў рад момантаў скажэньняў партыйнай лініі. Па другое — некаторыя ячэйкі слаба разгарнулі работу па вярбоўцы ў партыю рабочых лясной гаспадаркі—былых чырвоных партызан.

У паасобных ячэйках заявы аб прыёме ў партыю залежваюцца досыць доўгі час.

Гэтыя недахопы сельпартком павінен неадкладна ліквідаваць. Задача ўсёй партыйнай арганізацыі, яшчэ больш павысіць ролю сельпарткому ў разгортваньні партыйнай работы на вёсцы.

К. ВЕРАМЕЙЧЫК.

Галоўчынскі сельпартком у палоне апартуністычнай практыкі

Галоўчынскі сельпартком (Бялыніцкі раён) не мабілізаваў партыйных і калгасных мас на рэалізацыю вузлавой задачы, на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Адсутнасьць зьдзельшчыны ў калгасах прывяла да прарываў у правядзеньні важнейшых сельска-гаспадарчых работ і палітычных кампаній. **У калгасе «XII-цігодзьдзе Кастрычніка»** засталося ня выкапанай 25 гэктараў бульбы ў той час, як гэтую колькасьць пры наяўнай рабочай сіле ў калгасе, можна было-б выбраць літаральна ў некалькі дзён. У гэтым-жа калгасе засталося на полі і рад іншых культур: 2 га канюшыны, 2 га вікі і каля 7 га сенажаці. Лён яшчэ не разасланы.

Сельпарткомы і партыйная ячэйка не арганізавалі загатовак. Плян адгрузкі бульбы па Галоўчанскім сельсавеце выканан на 42 проц. па збожжы на 19 проц. і ільна-валакне — 1,8 проц.

Калгас засмечан кулацкімі элемэнтамі. Партыйныя арганізацыі ня ўжылі ніякіх мер для таго, каб ачысьціць ад іх калектыў, не далі рашучага адпору спажывецкім і рвацкім настроям, якія пад уплывам кулацкай агітацыі распаўсюджваюцца сярод найбольш адсталых калгаснікаў.

Бюро раённага камітэту партыі бязлітасна ударыла па апартуністычнай практыцы Галоўчынскага сельпарткому, абвясьціўшы сакратару яго тав. **Чупрынскаму** суровую вымову, а сакратару парт'ячэйкі калгасу «XII-цігодзьдзе Кастрычніка» — Цітаўцову —вымову. Упаўнаважаны раёну тав. **Макараў** па Галоўчынскім сельсавеце за апартуністычную практыку зьнят з работы старшыні райкалгассаюзу і атрымаў суровую вымову з папярэжаньем. Старшыня сельсавету—Якубовіч зьнят з работы і атрымаў суровую вымову.

Бюро РК вызначыла рад канкрэтных мерапрыемстваў па аздараўленьні калгасу «XII-цігодзьдзе Кастрычніка», па разгортваньні работы сельпарткому

Казлоў.

Сельпартком--не падрайком, а апорны пункт на вёсцы

Гэтага не зразумелі кіраўнікі Полацкай арганізацыі

У Полацкім раёне па працягу гэтага году арганізавана 6 сельпарткомаў. Сельпартком пры лугавым саўгасе **«Палата»** створан 20 жніўня 1931 году.

Пры стварэньні сельпарткому былі парушаны налажэньні ЦК КП(б)Б аб тэрытарыяльным і вытворчым прынцыпах, якія вызначаны ў дырэктыўным лісьце ЦК КП(б)Б райкомам, сельпарткомам і вясковым ячэйкам. У сфэру абслугоўваньня сельпарткому ўваходзяць 6 парт'ячэек, у тым ліку: **дзьве калгасныя, адна сельсавецкая, дзве транспартныя,** апрача саўгаснай (апорнай). Ва ўсіх ячэйках налічваецца 39 членаў і 33 кандыдаты партыі.

Як відаць з паданага, дырэктыва партыі аб тым, што «пры стварэньні сельпарткомаў выходзіць выключна з вытворчага прынцыпу і ні ў якім выпадку не з тэрытарыяльнага»—груба парушана. Гэта не магло не адбіцца па рабоце сельпарткому.

ЦК КП(б)Б указаў, што «сельпарткомы яднаюць ячэйкі ў радыусе ня больш 10-12 клм. ад апорнага пункту». І гэта налажэньне парушана. У сельпартком уваходзіць Юравіцкая ячэйка на адлегласьці 16 кілёмэтраў і ячэйка пры калгасе «Чырвоная паляна» на адлегласьці 18 клм.

Полацкі райком партыі да арганізацыі сельпарткомаў адносіўся надзвычай бюракратычна, фармальна, ніякай падрыхтоўчай работы не правёў.

Вось дакумант, які характарызуе «работу» па арганізацыі сельпарткому пры лугсаўгасе «Палата»:

САЎГАС «ПАЛАТА»

Пры гэтым накіроўваецца таварыш Грошаў, якога РК КП(б)Б прызначае (!?) сакратаром сельскага партыйнага камітэту пры саўгасе «Палата».

Нам. Сакратара РК КП(б)Б

СТРУТЫНСКІ.

Гэта «прызначэньне» зьяўляецца грубым парушэньнем унутрыпартыйнай дэмакратыі па-другое, па якой прычыне напісана адносіна на імя дырэкцыі саўгасу? Па-трэцяе, райком не правёў ніякай падрыхтоўчай работы па арганізацыі сельпарткому.

Тав. **Грошаў**, рабочы, сормавец, 25-цітысячнік, дзівячыся такім бюракратычным і непартыйным адносінам з боку РК КП(б)Б да стварэньня апорных пунктаў партработы на вёсцы—сельпарткомаў, — расказвае, як быў арганізован сельпартком пры саўгасе **«Банонь»**, былога Ветрынскага раёну.

— Там ня так аднесьліся да стварэньня сельпарткомаў. Спачатку райкомам партыі была створана брыгада для абсьледваньня работы партыйных ячэек у раёне саўгасу «Банонь». У камісію ўваходзіў і будучы сакратар сельпарткому. Камісія працавала два тыдні. Ячэйкі былі вывучаны ўсебакова. Пасьля абсьледваньня ў саўгас «Банонь» выехала бюро РК КП(б)Б у поўным складзе, правяло пасяджэньне. Прысутнічалі ўсе члены і кандыдаты ячэек прымацаваных да сельпарткому. Заслухалі справаздачы сакратароў ячэек і судаклад камісіі. Далі выразныя дырэктывы сельпарткому.

Пры стварэньні сельпарткому пры саўгасе «Палата» была дапушчана памылка і арганізацыйнага парадку. Сельпартком у складзе 5 членаў, на агульным сходзе 6 ячэек, выбралі, а апорная ячэйка пры саўгасе засталася са сваім бюро і сакратаром аж да апошняга часу. Фактычна стварылі падрайком. Толькі падаўна па прапанове інструктара райкому КП(б)Б, сакратар сельпарткому прыняў абавязкі і сакратара апорнай ячэйкі пры лугсаўгасе «Палата».

Ня гледзячы на тое, што да стварэньня сельпарткому з боку райкому КП(б)Б ня было належнай увагі і зараз няма адпаведнага кіраўніцтва, сельпартком па працягу 3-хмесячнай работы цалкам сябе апраўдаў.

Пачаўшы з агульнага сходу ячэек, выбару сельпарткому і вызначэньня чарговых задач, паводле ўстановак партыі, сельпартком сыстэматычна кіраваў ячэйкамі, даваў выразныя канкрэтныя дырэктывы і сачыў за іх выкананьнем.

Абгаварваўся даклад фракцыі **Алёсаўскага** сельсавету аб ходзе ўборачнай кампаніі і мабілізацыі сродкаў. За апартуністычную практыку зьнят з работы старшыня сельсавету.

Тут жа сельпартком заняўся пытаньнем кіраўніцтва работай камсамольскіх ячэек. Прынята пастанова аб арганізацыі шматтыражкі, адшуканы для гэтага па месцы сродкі. На гэтым жа пасяджэньні распрацаваны мерапрыемствы па разгортваньні партыйнай і камсамольскай вучобы.

Ужо па першым пасяджэньні сельпартком прыступіў да практычнага вырашэньня асноўнай задачы—да арганізацыйна-гаспадарчага **ўмацаваньня калгасаў.**

«2-я бальшавіцкая вясна», лічыць неабходным правесьці чыстку калгасу ад кулакоў. Ячэйцы пры станцыі Дрэтунь указана на недастатковы ўдзел у грамадзка-палітычных кампаніях і рабоце з беднатой. Вызначаны мерапрыемствы па **барацьбе за ўраджай, разьмеркаваньні ўраджаю, па арганізацыі адыходніцтва па загатоўках, самаабкладаньні і г. д.**

Сельпартком выяжджае ў **Юравіцкі** сельсавет і робіць пасяджэньні сумесна з партактывам. Заслухоўваецца інфармацыя партыйна—старшыні сельсавету аб ходзе ўбороачнай кампаніі і інфармацыі старшынь калгасаў аб становішчы работы ў калгасах. Усё гэта цесна ўвязваецца з арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў.

Сельпартком разьбірае пытаньне аб санспаборніцтве і ўдарніцтве ў лугсаўгасе, заслухоўвае даклад старшыні рабкому. Даюцца выразныя дырэктывы.

Сельпартком у сваёй рабоце ўзяў упор на ўзорнае наладжваньне работы лугсаўгасу. Мы пералічым толькі тыя пытаньні, якія разьбіраліся сельпарткомам і па якіх вынесены канкрэтныя дырэктывы: **выкананьне дагавораў з калгасамі аб вярбоўцы рабочай сілы, зямляўпараднаваньні саўгасу, аб узмацненьні адміністрацыйна-кіруючага складу, аб правілах унутранога распарадку, аб рабоце сталоўкі, арганізацыі рабкопу, супроцьпажарных мерапрыемствах і г. д.**

Сельпартком ні ў якай меры не затушоўваў ініцыятыву ячэек, сельсаветаў і інш. арганізацый.

Сельпартком змагаўся за пляпавасьць работы ўсіх арганізацый на тэрыторыі сваёй дзейнасьці. Так, па пытаньні аб разьмеркаваньні рабочай сілы па Юравіцкім сельсавеце, адзначаючы бясплянавасьць, сельпартком пастанавіў: «склікаць пры сельпарткоме нараду гаспадарчых арганізацый і паставіць пытаньне аб правільным скарыстаньні рабочай сілы». Нарада была склікана і няплянавасьць зьні-

Сельпартком заваяваў сабе вялікі аўтарытэт, паказаў сваю працаздольнасьць.

Аднак, дапушчаныя памылкі пры арганізацыі сельпарткому адмоўна адбіліся на рабоце. Транспартныя ячэйкі амаль па зьвязаны з сельпарткомам.

Полацкі РК КП(б)Б павінен неадкладна выправіць памылкі, дапушчаныя пры арганізацыі сельпарткому.

Дырэктывы ЦК партыі аб узмацненьні кіраўніцтва сельпарткомамі і ячэйкамі павінны быць выкананы. Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна ўзьняць на вышэйшую ступень ролю сельпарткомаў як апорных пунктаў партработы на вёсцы.

А. МІКУЦКІ.

Менш гаварыльні, пабольш спраў

Бацьвінаўскі сельпартком (Крычаўскі раён) арганізаваны месяцаў тры таму назад. За гэты параўнальна невялікі час яго дзейнасьці, пры ўмовах адсутнасьці практычнага вопыту работы сельпарткомаў, дасягнуты зрухі ў рабоце як апорнай, так і прымацаваных парт'ячэек.

Сельпартком складаецца з трох калгасных парт'ячэек: ячэйка калгасу **«Зара»** (апорная), калгасу, **«Бальшавік» і Маляўцкая** (прымацаваныя). Такім чынам сельпартком створан па вытворчым прынцыпе і абслугоўвае сваім кіраўніцтвам усе калгасы трох сельсаветаў. У гэтых сельсаветах завершана ўжо ў асноўным суцэльная калектывізацыя.

Першыя крокі работы сельпарткому заключаліся ў расстаноўцы партсіл і арганізацыйных мерапрыемствах па ўзмацненьні кіруючага складу калгасаў і жывёлагадоўчых фэрм. Ва многіх калгасах вылучаны партарганізатары, у двух — створаны партгрупы. Арганізацыя нізавых партзьвеньняў спрыяла павялічэньню партыйнага ўплыву на работу калгасаў, што вельмі важна пры ўмовах невыстарчальнага яшчэ арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня значнай часткі калгасаў, якія знаходзяцца ў радыусе абслугоўваньня сельпарткомам. Асноўным з дадатных момантаў у рабоце СПК зьяўляецца тое, што з пачатку яго існаваньня **ўзят правільны напрамак—КАНКРЭТНАСЬЦЬ У ВЫРАШЭНЬНІ ВУЗЛАВЫХ ПЫТАНЬНЯЎ І АПЭРАЦЫЙНАСЬЦЬ У КІРАЎНІЦТВЕ РАБОТАЙ ПАРТ'ЯЧЭЕК І КАЛГАСАЎ.**

Паставіўшы ў сваёй рабоце цэнтральнай задачай арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, СПК настойліва дабіваецца пераводу на сапраўдную зьдзельшчыну ўсіх галін работы ў калгасах, займаецца падборам лепшых калгаснікаў на кіруючую работу, ліквідацыяй абязьлічкі і безадказнасьці, якая яшчэ і зараз мае месца ў паасобных калгасах. Як правіла, пасьля прынятых пастаноў па тым ці іншым пытаньні неўзабаве праводзіцца **праверка выкананьня** іх па мясцох і дасцца належная дапамога. Сельпартком сваячасова рэагаваў на нездаровыя тэндэнцыі, якія выявіліся ў паасобных калгасах у часе падрыхтоўчай работы да разьмеркаваньня ўраджаю. У калгасах **«Зара», «Бальшавік», «На варце»** і іншых былі складзены перапавялічаныя кармовыя і фуражныя балянсы і адначасова мелі месца факты ўтойваньня сапраўднай ураджайнасьці. Абмеркаваўшы пляны разьмеркаваньня ўраджаю некалькіх калгасаў, сельпартком выправіў няправільны напрамак, узяты пры складаньні пляну, і завастрыў увагу калгасных мас на момантах спажывецкіх тэндэнцый і рвацтва, як варожых праяўленьнях.

У тых калгасах, дзе правільна пастаўлена арганізацыя працы, дзе парт'ячэйкі аддавалі належную ўвагу вытворчым задачам, з посьпехам праведзены гаспадарчыя работы. Эфэктыўнасьць такіх калгасаў наглядна паказана па павялічэньні даходаў калгаснікаў, якія добрасумленна працавалі. Да такіх калгасаў адносяцца «Барацьбіт», імя Будзённага, «Перамога», «Заветы Леніна» і «На варце», прычым у апошнім аплата працадзён параўнальна з мінулым годам павялічылася амаль на 100 проц. У часе абмеркаваньня планаў разьмеркаваньня ўраджаю ў калгасе «Зара» абвясьцілі сябе ўдарнікамі 60 чал., у калгасе імя Варашылава — 21 чал. і г. д. Наогул, у рабоце апорнай ячэйкі калгасу **«Зара» і** Маляўцкай ёсьць бясспрэчны пералом па выкананьні задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Што-ж датычыць парт'ячэйкі калгасу **«Бальшавік»**, дык тут справа ня рушыцца з месца. Ячэйку можна прызнаць непрацаздольнай. Амаль ніякай работы па ўзмацненьні працоўнай дысцыпліны ў калгасах не праводзіцца. Масавая работа падмяняецца грубым адміністраваньнем. Прычым, галавацянскімі ўчыпкамі адміністраваньня сам сакратар ячэйкі выдзяляецца больш за ўсіх.

На гэту ячэйку сельпарткому неабходна зьвярнуць сур'ёзную ўвагу і забясьпечыць неадкладнае паляпшэньне яе работы.

Істотныя недахопы ёсьць яшчэ і ў рабоце другіх ячэек. Зрухі, якія дасягнуты ў рабоце ячэек у сувязі з арганізацыяй сельпарткому, прыніжаюцца тым, што паасобныя актуальнейшыя пытаньні, пастаўленыя сельпарткомам перад ячэйкамі, не даводзяцца да канца. Напрыклад, па пытаньнях падрыхтоўкі калгасных кадраў, рахунковых работнікаў, па пытаньнях аўладаньня тэхнікай калгаснай вытворчасьці ёсьць у пратаколах пасяджэньняў СПК нядрэнныя пастановы, але запісанае застаецца і да апошняга часу толькі па паперы. Запісалі і на гэтым супакоіліся.

Ніяк нельга абыйсьці моўчкі пасяджэньне сельпарткому ад 15 верасьня, на якім абмеркавана, правільней кажучы «прапушчана гуртам» 16 пытаньняў. У даным кантэксьце неабходна паказаць іх зьмест:

1. Работа каапэрацыі.
2. Работа з калгасным актывам і падрыхтоўка кадраў.
3. Аб сіласаваньні.
4. Правядзеньне дня ўраджаю і калектывізацыі.
5. Правядзеньне дэкады жывёлагадоўлі.
6. Аб [illegible] і закрытыкі.
7. Становішча са зьдзельшчынай у калгасе «Бальшавік».
8. [illegible] для [illegible] басу.

Р[illegible] арганізацыі.

1. [illegible] ліквідных на [illegible], каб даказаць, што у такой пастанове **цы амаль усіх асноўных пытаньняў на адным пасяджэньні СПК выглядае элемэнт самастрахоўкі** («мы гаварылі, мы ўхвалялі»).

Наконт «гаварыльні» тут «усердзіны» хоць адбаўляй, а вось у адносінах глыбіні прапрацоўкі пытаньняў і канкрэтасьці іх вырашэньня — справа пікуды нягодная. Праўда, гэта агульны факт ўсёахапляючага парадку дня, але ён варты суровага асуджэньня. Самастрахоўка «пропускам» праз адно пасяджэньне **ўсяго месячнага пляну работы сельпарткому** вельмі няўдалая, яна дэманструецца тым крытэрыем, што **работа ацэньваецца па канкрэтных справах, а не па лічбах пасяджэньняў і колькасьці пастаўленых пытаньняў.**

Я. ІВ.

Праф. НАЙДЗЕНАЎ

За малочную карову *)

Жывёлагадоўля была самай адсталай галіной старой раздробленай індывідуальнай гаспадаркі. Ва ўмовах гэтай гаспадаркі ўжываць тэхніку было, зразумела, зусім немагчыма.

Вялізарныя магчымасьці для ўкараненьня тэхнікі ў жывёлагадоўлю адкрыла перад намі сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі. Толькі буйная гаспадарка (саўгас, калгас) дазваляе шырока ўжываць рад мерапрыемстваў тэхнічнага парад- [illegible] прадукцыйнасьці [illegible] ым збожжа- выключную аблеме жывё- [illegible] ванейшым вучастку мы ўжо дабіліся р ду сур'ёзных перамог. Дасягненьні колькаснага парадку зусім бясспрэчны. Але гэтым абмежавацца ўжо нельга. **Якасьць, узьняцьце прадукцыйнасьці малочнай жывёлы** — гэта задачы, якія ставяцца зараз, як **цэнтральныя пытаньні,** каб арганізацыйна і тэхнічна замацаваць дасягнутае і больш шпарка паўвацца наперад.

Пытаньні якасьці выразна падкрэслены ў пастановах партыі. Аб мерапрыемствах у галіне жывёлагадоўлі падрабязна гаварылася і тав. **Якаўлевым** на апошнім партыйным зьезьдзе. Пісалі і пішуць аб гэтым газэты, спэцыяльныя часопісі. Гэтыя ме- [illegible] насьці агульна [illegible] даказваць, што [illegible] ыйнасьці жы- [illegible] даць моцную карма- [illegible] мацца сіласа- [illegible] ранылоды, пе- [illegible] раходзіць да [illegible] ня і г. д. Галоўнае зараз у тым, каб гэтыя мерапрыемствы паглыбіць, дабіцца іх добраякаснага ажыцьцяўленьня, г. зн. укараніць тэхніку ў нашу сельскую гаспадарку. **Задача ў тым, каб шырокія масы калгаснікаў і рабочых саўгасаў зразумелі і ўсвоілі агратэхніку.**

На жаль, трэба канстатаваць, што мы мала зрабілі, каб работнікі, якія займаюцца сельскай гаспадаркай асабліва жывёлагадоўлай, асвоілі новую тэхніку, якой так багата наша сёнешняя вёска. Сустракаюцца нават дырэктары саўгасаў, якія не разумеюць і недаацэньваюць вялізарнага значэньня важнейшых тэхнічных прыёмаў. Між тым, без ужываньня гэтых прыёмаў немагчыма ўзьняць ураджайнасьць саўгасных палёў, удой саўгаснага стада.

Характэрным прыкладам зьяўляецца сіласаваньне. Гэтай справай займаюцца многія. Але з прычыны таго, што тэхніка сіласаваньня зусім мала вядома і ўсвоена, мы робім грубейшыя памылкі.

Уся сутнасьць заключаецца ў тым, каб, ажыцьцяўляючы пэўныя мерапрыемствы, зразумець і выканаць усе патрэбныя тэхнічныя прыёмы і дэталі. Толькі тады мы атрымаем 100-процантны эфэкт. Напрыклад, сіласаваньне перанята намі з заграпічнай практыкі. Ці скарыстоўваем мы ўсе тэхнічныя спосабы? Нічога падобнага. Толькі па 60-70 проц. У выніку невыкананьня цэлага раду дэталяй і дробязяй, якія ў практыцы маюць вялізарнае значэньне, мы і не дасягаем таго эфэкту, якога павінны былі дасягнуць. Ілюстрацыяй служыць амэрыканская сіласная вежа. Яе трэба будаваць з пэўнага матар'ялу (сухой, гладкай клёпкі), а будуем з такога дрэва, якое праз некаторы час дае шчыліны.

Адным з важнейшых задач арганізацыйна - тэхнічнага замацаваньня дасягненьняў у галіне жывёлагадоўлі зьяўляецца зьнішчэньне асноўных недахопаў, якія перашкаджаюць узьняць якасьць. Трэба з асаблівай выразнасьцю падкрэсьліць пашы тэхнічныя недахопы і ўпарта з імі змагацца. Гэтага можна з посьпехам дабіцца толькі на аснове шырокага ўкараненьня ведаў. На жаль, гэта яшчэ ня робіцца ў патрэбнай меры. Ня гледзячы па рад катэгарычных дырэктыў партыі, далёка ня ўсе нашы гаспадарнікі ўсьвядомілі **неабходнасьць вучыцца, усвойваць тэхніку.** Некаторыя дырэктары саўгасаў займаюцца сіласаваньнем, думаючы, што раз завёў сіласаваньне, дык яно само пойдзе. Між тым, **самацёкам нічога ня ідзе.** Эфэкту ў поўнай меры яны не дабіліся, бо ня ўжывалі належных тэхнічных спосабаў. Яны нават не прачыталі ні аднэй кнігі па пытаньнях сіласаваньня. Не таму, што гэтых кніг ня было, а таму, што з цагардай адносяліся да тэхнікі сіласаваньня.

З усяго комплексу мерапрыемстваў у справе ўзьняцьця прадукцыйнасьці рагатай жывёлы я лічу неабходным спыніцца на факце вялізарнага разрыву паміж **падтрымліваючым і прадукцыйным кормам.** Гэты факт зьяўляецца асноўнай перашкодай на шляху да ўзьняцьця прадукцыйнасьці малочнай жывёлы. Пытаньне аб падтрымліваючым і прадукцыйным корме не зьяўляецца навінай. Наадварот, яно вядома кожнаму зоатэхніку і аграному. Аднак, належнай увагі дапаму пытаньню ўсё-ж не аддаецца.

Усякі рацыён для малочнай каровы складаецца з двух частак: падтрымліваючага і прадукцыйнага корму. Першы корм ідзе для падтрыманьня жыцьця жывёлы, а другі — дапаўняе першы, дае магчымасьць атрымаць тую ці іншую колькасьць малака. Вытворчасьць малака залежыць у значнай ступені ад суадносін паміж падтрымліваючым і прадукцыйным кормам. Гэта можна ілюстраваць на наступным прыкладзе. Возьмем карову вагой у 400 кілёграм. Падтрымліваючы корм для гэтай каровы складзе 4,1 кармавых адзінак. Калі мы будзем жывёле даваць толькі гэту норму кармоў, дык малака мы не атрымаем.

Калі-ж да падтрымліваючага корму дадаць яшчэ 0,9 кармавых адзінак, дык атрымаем два кілёграмы малака, затраціўшы на ўсё кармленьне 5 кармавых адзінак. Суадносіны паміж падтрымліваючым кормам (82 проц.) і прадукцыйным (18 проц.) у даным выпадку будуць пяспрыяючымі.

Калі-ж мы дадамо 2,6 кармавых адзінак да падтрымліваючага корму, а ўсяго на кармленьне затрацім 6,7) адзінак, дык атрымаем 6 кілёграмаў малака. Калі-ж да падтрымліваючага корму дадаць 5,2 адзінак, дык атрымаем каля 12 клгр. малака (пры агульнай затраце 9,3 кармавых адзінак).

Такім чынам, правільныя суадносіны паміж падтрымліваючым і прадукцыйным кармамі зьяўляецца асноўнай умовай, ад якой залежыць правільны ўдой малака. Гэта ў свой час было падкрэслена на апошнім партзьезьдзе ў выступленьні тав. Якаўлева, які сказаў: «Для таго, каб карова дала цяперашнюю колькасьць малака —каля 1.000 кілёграм у год—ёй патрэбна 1.700 кармавых адзінак, а для таго, каб гэта-ж карова дала падвойную колькасьць малака, кармавыя адзінкі трэба павялічыць толькі на 30 проц».

І далей: «Для таго, каб карова пастроіла дачу малака, трэба колькасьць [illegible] з нак павялічыць на 50 проц.» Гэтыя словы тав. Якаўлева наглядна дэманструюцца на нашым прыкладзе.

Наогул ведаюць, што калі карову лепш карміць, дык яна будзе даваць больш малака. Але нам трэба ведаць не наогул, а ўмець дэтальна, з алоўкам у руках рабіць тыя ці іншыя разлікі. Аб падтрымліваючым і прадукцыйным корме гаворыцца ў кожным падручніку на першай старонцы і ўсе спэцыялісты здавалася-б аб гэтым ведаюць. Аднак, гэта асноўнае правіла не ажыцьцяўляецца.

Бывад такі — мы павінны абавязкова ў бліжэйшы-ж час наладзіць правільнае кармленьне ў саўгасах і калгасах, паступова ўводзячы такі рацыён, каб паміж падтрымліваючай і прадукцыйнай часткамі корму былі прынамсі суадносіны 50:50 проц., або яшчэ лепш 40:60 проц.

Калі гэта будзе ажыцьцёўлена, дык рэзка павялічыцца прадукцыйнасьць малочнай гаспадаркі, не рэнтабельнасьць. З так званым «навозным» кармленьнем каровы павінна быць рашуча пакончана.

Было-б няправільна абмежавацца ўстанаўленьнем толькі правільных суадносін паміж падтрымліваючым і прадукцыйным кормам. Гэтага мала. Неабходна, каб патрэбная колькасьць кармоў яшчэ адпавядала пэўнай якасьці. Калі карове ня даць бялкоў, дык і пры правільных суадносінах кармоў яе прадукцыйнасьць не павялічыцца. Таму патрэбна такая арганізацыя кармленьня, каб алі-б на кожную кармавую адзінку прыпадала мінімум 190 грам бялку. Між тым, паводле падлікаў праф. Ліскуна, якасьць нашых кармоў у шмат выпадках невыстарчальная — толькі 70 грам бялкоў на кармавую адзінку.

Калі мы хочам ліквідаваць стары погляд на карову, як на «навозную» жывёлу і сапраўды дабіцца 100-процантнага эфэкту ад ужываньня патрэбных суадносін паміж падтрымліваючым і прадукцыйным кормам, трэба біцца за ўзьняцьце якасьці кармоў, за павышэньне ўдзельнай вагі бялкоў у іх.

У сьвятле гэтага неабходна адзначыць недапушчальныя адносіны да ўборкі ўраджаю ў шмат якіх мясцох, што непасрэдна вядзе да вялізарнага зьніжэньня якасьці кармоў. Як прыклад, зноў возьмем сіласаваньне. Сіласаваньне кармоў — гэта такі тэхнічны прыём, які ў значнай ступені вырашае кармавую праблему, бо ён дае магчымасьць уводзіць рад новых высокакаштоўных кармавых культур і захаваць іх на зіму. Напрыклад, **сланэчнік з аднаго гэктара дае прыблізна 7 тон кармавых адзінак у той час, як старыя культуры—салома і мякіна — толькі 2 тоны кармавых адзінак.** Аднак, выгады сіласаваньня і сіласных культур далёка ня ўсімі ўсьвядомлены, тэхніка гэтай справы не захоўваецца. Праведзеныя разьлікі правільны ў тым выпадку, калі захоўваць усе тэхнічныя прыёмы. У нас-жа часта робіцца інакш, самацёкам. **Замест таго, каб сіласаваць яму два тыдні, сіласуюць два месяцы.** Сёньня прывезьлі і накідалі зялёную масу, а потым зрабілі перапынак на некалькі дзён. У выніку—**маса пачынае загарацца.** Гаспадарнік, які па - паляваецельску адносіцца да тэхнікі, не разумее, што тут адбываецца працэс браджэньня, у выніку чаго згараюць усе спажыўныя матэрыі, а гэта значыць згараюць кармавыя адзінкі. Выходзіць, што фармальна сіласаваньне правялі, а фактычна належнага эфэкту не дабіліся.

На неабходнасьць поўнага ажыцьцяўленьня ўсяго комплексу тэхнічных спосабаў пры правядзеньні пэўнага мерапрыемства трэба зьвярнуць увагу ўсёй грамадзкасьці, усіх партыйных арганізацый. Наколькі дорага нам абыходзіцца павярхоўная работа, стара прывычка працаваць і адносіцца да сваіх абавязкаў абыяк сьведчаць паступныя некалькі лічбаў. З навуковых даных вядома, што калі дзяна правесьці сіласаваньне, дык прыблізна згарае каля 30 проц. матэрыі. Мы прыблізна засіласавалі 380 тысяч тон масы, прычым рэдка дзе ўжывалі ўсе тэхнічныя патрабаваньні. Згарэла каля 10.000 тон кармавых адзінак, якія пайшлі ў паветра — іх зьелі бактэрыі. Прапала дзесяткі тысяч тон малака. Тое-ж самае можна сказаць і аб уборцы сена.

А вось калі падлічыць страты ад негаспадарчых адносін пры ўборцы сена, дык атрымаем, што і тут гінуць дзесяткі тысяч тон малака.

Паданыя прыклады — яркая ілюстрацыя таго, што іменна ўлік дае нам магчымасьць выявіць недахопы і памылкі ў правядзеньні пэўных тэхнічных мер, сапраўдны малюнак дзейнасьці тэй ці іншай гаспадаркі, прадявіць ёй адпаведныя патрабаваньні. Ведаючы колькасьць выдаткаваных кармоў і надоенага малака ўжо можна меркаваць, як ідзе справа ў гэтай гаспадарцы, бо жывёла, як гаварылася вышэй, пры пэўных правільных кармленьня дае пэўную колькасьць малака, а гэтыя суадносіны нам вядомы.

Каб падлічыць, колькі сапраўды трэба было данай гаспадарцы выдаткаваць за зіму кармавых адзінак, трэба толькі ведаць агульную колькасьць надоенага за гэты час малака. Калі перавесьці кармавыя адзінкі ў тыя прадукты, якія скармліваліся жывёле, дык стане вядома больш-менш правільная сума кармоў, якая павінна была быць выдаткавана. Тут розьніца паміж тэй колькасьцю кармоў, якая павінна была быць расходавана і якая фактычна расходавана адразу выявіцца. Вялікая розьніца будзе гаварыць аб яўна няправільным вядзеньні гаспадаркі, аб нізкай якасьці кармоў, а часам і аб злоўжываньнях. Ва ўсякім выпадку ўлік прымусіць шукаць прычыны разрыву і выпрацаваць мерапрыемствы да іх ліквідацыі. Правільная пастаноўка ўліку прымусіць падцягнуцца і гаспадарнікаў, усіх тых, хто адказвае за справу, прымусіць іх з большай адказнасьцю адносіцца да сваіх абавязкаў. Шляхам уліку мы можам праверыць работу і гаспадарак, якія займаюцца гадоўлай малапяка, разьвядзеньнем сьвіней і г.

Для таго, каб узьняць прадукцыйнасьць буйной рагатай жывёлы мы зьвярнуць увагу толькі на адно кармленьне. Трэба адначасова весьці работу і па паляпшэньні самой жывёлы і ажыцьцявіць рад іншых мерапрыемстваў. Але гэта вялікія спэцыяльныя тэмы і аб іх трэба гаварыць асобна.

---

*) З выступленьня па нарадзе БКЗБ па пытаньнях ўраджайнасьці.

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЗМАГАЦЦА ЗА ЯКАСЬЦЬ

ФАБРЫКІ „ПРАФІНТЭРН“ І „СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ“ „СПАБОРНІЧАЮЦЬ“ НА КОЛЬКАСЬЦЬ БРАКУ

Барацьбу за якасьць—у парадак дня кожнай брыгады!

Пакончыць з бракам

«Зьвязда» шмат раз указвала на непушчальнае адставаньне швэйнай прамысловасьці ў справе паляпшэньня якасьці прадукцыі. Выканаўшы пяцігадку ў тры гады, дасягнуўшы вялікіх посьпехаў у выкананьні колькасных і якасных паказальнікаў (па прадукцыі працы, зьніжэньні сабекошту), швэйныя фабрыкі зусім слаба змагаюцца за якасьць пашыўкі адзеньня, якая ідзе на задавальненьне патрэб шырокіх мас працоўных. Ня выконваецца адна з асноўных дырэктыў партыі, не выконваецца указаньне сакратара ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧА, зробленае ім у прывітаньні швэйнікам з поводу выкананьня пяцігодкі ў тры гады.

Асабліва нізкую якасьць работы дае лепшая фабрыка «ПРАФІНТЭРН». Каманэнцы брыгады «Зьвязды» даводзілі падрабязна асьвятленае выпадкі вытворчу браку і вінаватых у гэтым. Вінаваты, па-першае, ПААСОБНЫЯ ГРУПЫ АДСТАЛЫХ РАБОЧЫХ, якія ў пагоні за колькасьцю і проста па нядбайнасьці забываюць аб якасьці, па-другое, КАНТРОЛЬНЫ АПАРАТ, які ва мноствы выпадках не заўважае дрэннай работы, па-трэцяе — ФАБРЫЧНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, якія не вядуць спрад рабочых і работніц выстарчальнай масавай растлумачальнай работы аб неабходнасьці барацьбы за якасьць прадукцыі. Ня першае становішча і на фабрыцы «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ», дзе фактычны брак перавышае плянавыя меркаваньні ў 18 раз.

Добраякаснасьць швэйнай прадукцыі — нямалаважнае зьвяно ў справе паляпшэньня матар'яльна-бытавога становішча шырокіх рабочых мас, у справе выкананьня ўказаньняў т. Сталіна.

Таму паляпшэньню якасьці швэйнай прадукцыі павінна быць аддана МАКСЫМУМ УВАГІ. Усе сілы павінны быць кінуты на барацьбу З РАСХЛЯБАНАСЬЦЮ, БЕЗАДКАЗНАСЬЦЮ, АБЯЗЬЛІЧКАЙ, якія ствараюць горы браку і выклікаюць зусім правільныя нараканьні рабочага-пакупніка.

ШЛЯХАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГАСПАДАРЧАГА РАЗРАХУНКУ, ЗЬМЕНА-СУСТРЭЧНАГА ПЛЯНАВАНЬНЯ, ПРЭМІЯЛЬНАЙ СЫСТЭМЫ АПЛАТЫ ЛЕПШАЙ ПРАЦЫ, КАНТРОЛЬНАГА СПАБОРНІЦТВА ПА ПРАФЭСЫЯХ — трэба мабілізаваць перадавікоў-ударнікаў, энтузіястаў і ўсіх рабочых на барацьбу за якасьць. Перамога швэйнікаў — выкананьне пяцігодкі ў тры гады — будзе далёка няпоўнай, калі яны У БЛІЖЭЙШЫЯ ТЫДНІ не дабіюцца рашучага перапому ў паляпшэньні швэйнай прадукцыі.

Ганебныя факты

Швэйная фабрыка «Прафінтэрн», (Віцебск), датэрмінова скончыўшы пяты трэцяга кварталу, выканаўшы колькасных паказальнікаў пяцігадкі плян за тры гады,—перамажна ідзе наперад, перавыконваючы амаль усюды сваю вытворчую праграму. Але гэта ні ў якім разе ня зьнімае з фабрычных арганізацый абавязаньне якасных паказальнікаў і выкананьне належнага стандарту.

Мінулым, рад ганебных фактаў зусім абраўчы гаворыць за тое, што фабрычныя арганізацыі не вядуць належнай барацьба за якасьць прадукцыі.

Напрыклад пляну, брак павінен дасягнуць больш 0,3 проц., а фактычна за верасень брак дасягае 7 проц. Зусім вялікую лічбу браку за верасень даў цэх палітo—9,8 проц.

Вельмі дрэнна працуе ватны цэх. Ватаны падкладках разьмяркоўваецца нерэгулярна (дзе больш, дзе менш). Ватаны выкройваюць па лякалі. Ёсьць шмат выпадкаў, калі 48-мі разьмерны пазы прышываецца да 44-га разьмеру сьпінкі і наадварот.

Адхіленьні разьмеры браку цэх палітo не адстае ад ватнага. Няправільная падрэзка падбартоў, няправільная строчка кашэнаў, канцікаў і бакоў, замена [illegible] — гэта вельмі частае [illegible] у гэбоке цэху палітo.

Зусім [illegible] адносяцца да сваіх абавязкаў кантралёры. Так, кантралёр [illegible] прапусціў рукавы без насечак, [illegible] Гайдук прапусціў партыю з зрэзанымі галавінамі.

Ёсьць шмат браку па віне закройнай фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі». На апэрацыі № 20 зусім рэдка калі высьцёгваюцца лацканы—замест 88 радоў—4. Ніжнія каўперы стачваюцца няроўна, вылазяць швы і г. д.

У цэху палітo былі і такія выпадкі, калі няправільна зроблены паўфабрыкат кантралёр Семчанка адкладваў для пераробкі, а інструктар цэху Крупскіч гэты паўфабрыкат пускаў далей у ход.

У цэху ёсьць ударнікі, барацьбіты за якасьць. Работніца Скундовіч нікоўі не прапускае нядобраякаснай работы, тав. Цялкін—адзін з лепшых змагароў за якасьць прасавання. Самуйлаў і Шкайдэрман—рэзэрвікі заўсёды даюць добраякасную работу.

Да зрыўшчыкаў якасных паказальнікаў прамфінпляну цэху палітo адносяцца рабочыя Сімановіч і Ліберман, якія заўсёды няўважліва адносяцца да работы, кантралёр Кацэў, інструктар Каган Эля, які за агідныя адносіны да якасьці прыцягнут да судовай адказнасьці.

У цэху паўпалітo таксама маюць месца такія факты, калі апэрацыя падрэзкі сьпінак робіцца няправільна. Хлясьцікі вышываюцца шырокім швом, рукавы ўшываюцца абыяк, лямоўка падбартоў таксама робіцца няправільна.

Юдовіч і Эльфанд — гэта рабочыя, якія сыстэматычна псуюць свае апэрацыі. Наадварот, т.т. Савіцкая, Блох, Шаблінская — прыкладныя рабочыя, якія побач з колькаснымі паказальнікамі выконваюць і якасныя.

У цэху дзіцячых палітo справа з захоўваньнем якасьці стаіць лепш, але і ў гэтым цэху маюць месца нядбайныя адносіны да работы з боку неакторых рабочых. Футровыя каўпяры абшываюцца рэдка і слаба, дрэнна прышываецца парусіна, ярлыкі заўсёды блытаюцца і г. д.

Арк. Зарубежны, Міхась Ударны.

Тав. ШАБАНАЎ — лепшы ўдарнік заводу «Камунар».

Тав. Шчурэвіч — лепшы ўдарнік зав. «Камунар».

У 18 раз больш браку

Сыстэматычнае невыкананьне прамфінпляну швэйнай фабрыкі «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ» прымушае біць трывогу.

Плян 3-га кварталу выканан толькі на 66 проц., усяго за 3-ці квартал не дадана 32.744 пар брук, 26.187 піджакоў і 23.903 палітo.

У кастрычніку бручны цэх недадаў 50.844 брук, піджачны—23.858 піджакоў і палітo-цэх—2869 палітo. УСЯГО ЗА 4 МЕСЯЦЫ НЕДАДАНА НА 160.605 адзінак.

Ня выконваюцца і якасныя паказальнікі: брак замест 0,3 проц. паводле пляну дасягнуў—5,5 проц., г.зн. У 18 РАЗОЎ БОЛЬШ. Пераробкі ўвайшлі ў сыстэму. Аб дрэннай якасьці прадукцыі сьведчыць той факт, што НА ПРАЦЯГУ 4-х МЕСЯЦАЎ ЗА ПЕРАРОБКУ ПРАДУКЦЫІ АДМІНІСТРАЦЫЯЙ УПЛОЧАНА 26.526 РУБ.

Прамфінплян ня выконваецца нават і пры тых умовах, калі на вытворчасьці маецца пішняя рабочая сіла. Так, у 3-м квартале замест прадугледжаных плянам —3417 чал. фактычна працавала 3761 ч.

Сюды не ўваходзяць 12.000 рабочых дзён, адпрацаваных на 6 суботніках і наогул звышнармовая работа, якая таксама ўвайшла ў сыстэму. ЗА ЗВЫШНАРМОВУЮ РАБОТУ З ЛІПЕНЯ ПА КАСТРЫЧНІК АДМІНІСТРАЦЫЯ ЗАПЛАЦІЛА 86.931 РУБ.

Ва ўсіх цэхах ёсьць вялікія запасы няскончанай прадукцыі; УСЯГО НАЛІЧВАЕЦЦА РОЗНАЙ НЯСКОНЧАНАЙ ПРАДУКЦЫІ—76.755 АДЗІНАК, ПРЫБЛІЗНА НА 2 МЛН. РУБ.

Усе гэтыя факты і лічбы выразна гавораць аб тым, што сучаснае кіраўніцтва фабрыкі не забясьпечвае выкананьня пастаўленых перад ёй задач.

З.

Выкананьне 6-ці ўмоў тав. Сталіна дае перамогу

Швэйная фабрыка імя Дзяржынскага (Бабруйск) увесь час працавала з вялікімі перабоямі. Дрэнна было наладжана грамадзкае харчаваньне, а таксама забесьпячэньне рабочых кватэрамі. У тарыфнай сыстэме існавала дробна-буржуазная ўраўнілаўка, якая выклікала цякучасьць рабочай сілы.

Пасьля прамовы тав. Сталіна і парады дырэктароў па працы, скліканай Белшвэйаб'яднаньнем, ідзе перабудова ўсёй сыстэмы працы ў адпаведнасьці з 6-ю ўмовамі тав. Сталіна.

Зараз па фабрыцы імя Дзяржынскага пабудавана вялікая сталоўка закрытага тыпу. Якасьць абедаў знач на палепшылася. Сталоўка абслугоўвае ўсе тры зьмены гарачай стравай. Ліквідавана чарга. Фабрыка прымацавана да закрытага рабочага каапэратыву, палепшылася рабочае забесьпячэньне прамтаварамі.

Ёсьць вялікія дасягненьні ў забесьпячэньні рабочых кватэрамі. Будуецца інтэрнат на 50 кватэр. Адкрыты ясьлі, якія наведвае 65-70 дзяцей работніц фабрыкі. Ясьлі пакуль што абслугоўваюць першую і другую зьмену.

Тарыфная сыстэма таксама перабудавана. Ліквідавана «украінская сыстэма» вучоты выпрацоўкі і аплаты, якая ўносіла элементы ўраўнілаўкі. Многа рабочых пераведзены на зьдзельную аплату, што прывяло да паралічэньня прадукцыйнасьці працы і росту зарплаты. На піджачных істужках больш кваліфікаваныя рабочыя пераведзены на вышэйшыя разрады. У першым агрэгаце, які мае прарыў у выкананьні прамфінпляну, уведзена прагрэсыўна - прэміяльная зьдзельшчына.

Пераведзена на зьдзельную працу частка рахункавых работнікаў.

Гэтыя посьпехі трэба замацаваць і поўнасьцю рэалізаваць указаньні тав. Сталіна, тады фабрыка стане ў радох першых па выкананьні прамфінпляну.

Меляхавіцкая, Гольдштэйн, Сурпін, Каган.

Тав. ЯКАЎЛЕЎ — лепшы ўдарнік заводу «Камунар».

У ФЭРМАХ 10 РАЕНАЎ НЕ ПАСТАЎЛЕНА НІ АДНАГО ЦЯЛЯЦІ

Энэргічна будаваць і камплектаваць фэрмы па гадоўлі маладняка

Апошні месяц ня даў ніякіх зьмен

«Зьвязда» ўжо ня раз зварачала ўвагу грамадзкасьці на недапушчальна марудных тэмпах камплектаваньня фэрм па гадоўлі цялят і маладняка.

Кастрычнік месяц ня ўнёс ніякіх зьмен. Па 889 фэрмах паступіла 17.610 шт., г. зн. 17,6% плану. У гэту колькасьць уваходзіць толькі 2.544 шт. укамплектаваных за лік загатовак.

Апартуністычныя гутаркі аб перэптабельнасьці цялячых фэрм усё яшчэ наглядаюцца ў некаторых мясцох. Паасобныя работнікі і спэцыялісты калгаспа-зямельнай сыстэмы (напрыклад, зоатэхнік Лутц, Мазыр), замест разгортваньня баявой работы па выкананьні пляну камплектаваньня, займаюцца разважаньнямі аб немагчымасьці арганізацыі спэцыялізаваных фэрм, іх нявыгаднасьці і г. д., адлюстроўваючы па сутнасьці кулацкія настроі.

Добрых вынікаў дасягнуў рад раёнаў, якія ўсьвядомілі важнасьць стварэньня цялячых фэрм і ўжылі ў гэтым напрамку рашучыя меры арганізацыйна-масавага парадку. Да такіх раёнаў адносяцца: **Клімавіцкі, які выканаў плян камплектаваньня ўжо на 90%, Койданаўскі—на 60%, Слуцкі — на 52%.**

Побач з гэтым трэба адзначыць, што **Бешанковіцкі, Расонскі, Шклоўскі, Вузьдзенскі, Кармянскі, Чачэрскі, Камарынскі, Любаньскі, Пятрыкоўскі і Віцебскі** раёны да сёпешняга дня **не распачалі работы** па афарміленьні фэрм, **не паставілі ні аднаго цяляці,** маючы заданьне па 1.000 і больш галоў.

Вушацкі, Гарадоцкі, Дрысенскі, Лепельскі, Сіроцінскі, Асіпавіцкі, Лагойскі, Плошчаніцкі, Прапойскі, Стара-Дарожскі, Уваравіцкі, Жыткавіцкі, Бягомльскі, Бярэзінскі, Клічаўскі і Крычаўскі раёны, праўда, вызначылі фэрмы і паставілі цялят, якія ёсьць у калгасах і калгасьнікаў, але на гэтым супакоіліся. Тут ні аднаго цяляці за лік загатовак не пастаўлена, у той час, як парады ляжаць яшчэ з верасьня і павялічэньне калгаспага стада маладняком за кошт неаграмаджанага сэктару зьяўляецца важнейшай задачай.

Паданыя факты гавораць аб тым, што большая частка раёнаў БССР яшчэ не пераключылася на выкананьне пляну будаўніцтва фэрм па гадоўлі цялят і маладняка. Рад раённых калгасных арганізацый злачынна ігнаруе дырэктывы партыі па гэтым пытаньні. Некаторыя загатоўчыя арганізацыі проста бязьдзейнічаюць, лічачы камплектаваньне справай выключна калгассаюзаў.

Органы ЦКК РСІ павінны выявіць канкрэтных вінаватых у зрыве камплектаваньня цялячых фэрм у рэдзе раёнаў.

Гр-ч.

Фэрмы без цялят

БЫХАЎ.

Арганізацыя і ўкамплектаваньне спэцыялізаваных фэрм, **асабліва цялячых,** праходзіць у Быхаўскім раёне зусім нездавальняюча. Плян камплектаваньня цялячых фэрм выканан усяго на 22 проц.

Па Быхаўскім раёне прадугледжвалася арганізацыя 44-х сьвінаводных фэрм з 4528 сьвінаматкамі. На 1 лістапада створана 34 фэрмы і пастаўлена 1361 сьвінаматка — 30 проц. заданьня. Малочна-таварныя фэрмы ўкамплектаваны ўсяго на 68 проц.

Па асобных сельсаветах малюнак яшчэ горшы. Так, тры СКТФ **Таймана ўскага** сельсавету яшчэ наогул не пачалі камплектаваньня. З шасьці СКТФ, арганізаваных у калгасах **Боркалабаўскага** сельсавету, сьвінаматкі ёсьць толькі ў аднэй. Такое-ж становішча ў **Макранскім, Званецкім і Абідавіцкім** сельсаветах.

Ужо два гады, як цягнецца будаўніцтва сьвінарнікаў у **Вялікасялецкім, Чыглінскім і Падсельскім** сельсаветах і ніяк ня можа быць закончана.

Такавы вынікі палітычнай недаацэнкі значэньня хуткага разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі, якая праяўляецца арганізацыямі пералічаных сельсаветаў.

Быхаўскі райкалгассаюз ня ўжывае належных мер, каб забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў будаўніцтва і камплектаваньня фэрм, каб ліквідаваць гэтыя прарывы. Даволі адзначыць, што 2 тэхнікі-будаўнікі райкалгассаюзам скарыстоўваюцца на будаўніцтве базы станцыі Быхаў, а не на будаўніцтве абораў і сьвінарнікаў. Зоатэхнікі Вапшаў і Шэвялёў большую частку часу сядзяць у горадзе. Яны ні разу яшчэ ня былі ў сельсаветах, якія далучаны да Быхаўшчыны, у сувязі з узбуйненьнем раёну.

Такому становішчу павінен быць пакладзен канец. Раён мае ўсе магчымасьці выканаць плян камплектаваньня і будаўніцтва спэцыялізаваных фэрм. Скарыстоўваючы ўнутраныя рэсурсы, Быхаўшчына можа і павінна ажыцьцявіць пастаўленыя перад ёю задачы ў галіне разьвіцьця жывёлагадоўлі.

М. Дуброўка

Куды дзець загатоўленых цялят

Да 1 кастрычніка **Бабруйскі мясакамбінат** павінен быў здаць спэцыялізаваным калгасным фэрмам 470 штук маладняка. Аднак, з прычыны таго, што **Калгассаюз адкладае прыём маладняка,** справа не пасоўваецца наперад. Наглядаюцца выпадкі, калі цяляты стаяць у райзагу цэлымі тыднямі і іх ніхто не забірае. У выніку **цяляты накіроўваюцца на забой.**

Брагінскі райкалгассаюз да гэтага часу яшчэ не прыступіў да арганізацыі таварных фэрм па гадоўлі маладняка. Плян камплектаваньня фэрм райкаапсаюзу ня дап. Такім чынам, загатоўчыя арганізацыі фактычна пазбаўлены магчымасьці весьці загатоўку цялят і ўкамплектоўваць імі фэрмы, бо **фэрм ня існуе.**

Лоеўскі райкаапсаюз, атрымаўшы ад Белмяса нарад на ўкамплектаваньне калгасаў цялятамі, зьвярнуўся да райкалгассаюзу з просьбай даць сьпіс калгасаў, якім трэба перадаваць цялят. Але адказу да гэтага часу не атрымаў. Не атрымаў адказ і на просьбу паведаміць, як разьмеркаваць ужо загатоўленых цялят.

Глускі райкаапсаюз павінен даць 1490 цялят калгасам. Пляну ўкамплектаваньня райкалгассаюз ня выпрацаваў. Невядома куды падзець ужо загатоўленых цялят? Да 1 кастрычніка калгасам трэба было перадаць 300 цялят. Амаль нічога ў гэтай галіне ня зроблена.

Прыведзеныя факты яркі гавораць аб злачынных адносінах раду райкалгассаюзаў да арганізацыі таварных цялячых фэрм. Наперакор неаднаразовым і катэгарычным дырэктывам аб разгортваньні сапраўды баявой работы ў гэтай галіне, у Брагіне, Лоеве, Глуску і Бабруйску амаль нічога ня робіцца. Камплектаваньне зрываецца па віне райкалгассаюзу. Вінаватыя павінны быць прыцягнуты да строгай адказнасьці.

В.

Пра скарыстаньне ільняной кастрыцы ў папяровай прамысловасьці

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што:

а) скарыстаньне кастрыцы, як сырцу для папярова-цэлюлёзнай прамысловасьці, мае вялізарнае народна-гаспадарчае значэньне і адкрывае новыя перспэктывы ў індустрыялізацыі БССР;

б) праблема скарыстаньня кастрыцы зьяўляецца ня толькі рэспубліканскай але мае і вялізарнае значэньне для ўсяго СССР у сэнсе ўмацаваньня базы абслугоўваньня культурных патрэб працоўных мас СССР;

в) ужываньне кастрыцы, як прадукту альходу заводаў першапачатковай апрацоўкі ільну, у папяровай прамысловасьці зьяўляецца зусім гаспадарча-мэтазгодным;

г) ужываньне кастрыцы на працуючых цэлюлёзных заводах замест жытняй саломы, на падставе папярэдніх калькуляцыйных разьлікаў тэхналягічна і эканамічна сябе апраўдвае. Прыняць да ведама паведамленьне тав. Споніма аб тым, што ва ўмовах Добрускага цэлюлёзнага заводу ў сучасны момант ўжываньне кастрыцы дае вялікае зьніжэньне сабекошту цэлюлёзы (80 руб. тона);

д) найбольш рацыянальнае скарыстаньне кастрыцы ў папяровай прамысловасьці зьвязана з пераводам заводаў па першапачатковай апрацоўцы ільну на мешаны від аналу, а там, дзе гэта немагчыма, трэба строга прытрымлівацца нармальнага рэжыму выдаткаваньня кастрыцы, як аналу, у адпаведнасьці з праектнымі данымі, дапускаючы спальваньне кастрыцы ў разьмеры не больш 50 проц. агульнай яе масы.

е) асабліва рэнтабэльным зьяўляецца ўжываньне кастрыцы пры ўмове камплектаваньня заводаў па першапачатковай апрацоўцы ільну з ільнянымі заводамі, а ў асобных выпадках — арганізацыі цэлюлёзных заводаў у раёнах, дзе згуртавана асноўная сетка заводаў па першапачатковай апрацоўцы ільну (раёны б. Віцебскай і Аршанскай акруг).

Выходзячы з паказанага, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Адзначыць каштоўную работу, праведзеную Надукова-Дасьледчым Інстытутам прамысловасьці ў галіне скарыстаньня кастрыцы.

2. Абавязаць Белільнапенькатрэст забясьпечыць кастрыцаю папяровую прамысловасьць у адпаведнасьці з затвярджанымі існуючымі прадпрыемствамі і праектаванага будаўніцтва, для чаго Белільнапенькатрэст павінен пачаць з 1932 г. пераводзіць заводы па першапачатковай апрацоўцы ільну на іншы і вызмешаны від аналу з тым, каб асноўнае ўсю выдаткаваць кастрыцы, а ў асобных выпадках і пераводзіць немагчымы, з бясьпечным нарастаньнем выдаткаваньня кастрыцы, на апрацоўку адпаведнасьці з праектнымі данымі на больш 50 проц. агульнай яе масы.

3. Прапанаваць ВСНГ пачаць укараняць кастрыцу ў папяровую прамысловасьць на існуючых прадпрыемствах, у адпаведнасьці з вытворчымі магчымасьцямі і рэсурсамі сырцу.

4. Прапанаваць ВСНГ і Белільнапенькатрэсту ў месячны тэрмін канчаткова дасканаліць кошкасьць кастрыцы, якая можа быць перадана папяровай прамысловасьці для скарыстаньня, выходзячы з пэрспэктыў разьвіцьця ільводзтва і ільнапрамысловасьці БССР, канца бягучага году і на наступную пяцігодку.

5. Прапанаваць ВСНГ разам з Народным Камісарыятам Зямляробства распрацаваць пытаньне аб арганізацыі камбінатаў першапачатковай апрацоўкі ільну і цэлюлёзна-папяровых фабрык.

6. Лічыць патрэбным уключыць у кантрольныя лічбы на 1932 г. асыгнаваньні на пачатак праектаваньня і падрыхтоўчыя работы па будаваньні новай папяровай фабрыкі, якая будзе працаваць на ільняной кастрыцы, і па будаваньні цэлюлёзнага камбінату.

7. Прапанаваць Навукова-Дасьледчаму Інстытуту прамысловасьці шырока алучаць у рэспубліканскім, а таксама і ў саюзным друку вынікі сваіх дасьледаў па ўжываньні кастрыцы ў папяровай прамысловасьці для перанясеньня гэтых дасьледаў у іншыя раёны СССР.

8. Прызнаць патрэбным прэміяваць работнікаў Навукова-Дасьледчага Інстытуту прамысловасьці, работнікаў ВСНГ, рабочых і тэхнічных пэрсанал Добрускай фабрыкі, якія ўдзельнічалі ў праведзеньні дасьледаў па вырабе паперы з ільняной кастрыцы.

Даручыць Прэзыдыуму ВСНГ вылначыць кола асоб, якія павінны быць прэміяваны, а таксама ўстанавіць разьмер прэміі.

9. Лічыць патрэбным пры складаньні новай пяцігодкі абавязкова ўлічыць у поўным абёме перспэктывы разьвіцьця папяровай прамысловасьці ў сувязі з разгортваньнем ільнаводзтва ў БССР, а таксама і іншых відаў сырцу.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД
Кіраўнік спраў СНК і ЗКАСА БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

Андрэй Александровіч.

Літаратурныя нататкі

ГОД ПЕРАЛОМУ

1931 год зьяўляецца годам рашучага пералому ў справе ажыцьцяўленьня пралетарскага літаратурнага руху, годам узмацненьня масава-палітычнай працы, годам творчага росту.

Першай і найважнейшай нашай перамогай зьяўляецца тое, што МенАПП здолеў у значнай меры перабудаваць сваю работу, зрабіць яе масавай, арганічна ўвязаўшыся з агульным ходам сацыялістычнага будаўніцтва. Ажыцьцёленая работа асацыяцыі стварае патрэбныя ўмовы ў дапамагае хутчэйшай перабудове письменьніка.

Актыўны ўдзел брыгад МенАПП'у ў масава-палітычнай працы прадпрыемстваў (работа ў заводзкай шматтыражцы, цэхавых насьценгазэтах, арганізацыя літгурткоў, вечароў і г. д.) ішоў агульным рэчышчам працы ўсяго выкананьне прамфінпляну. Працуючы на прадпрыемстве, уключыўшы ў капэнну ударнікаў-змагароў за пяцігодку, письменьнікі (а гэтага раней ня было) ў пэўнай меры азнаёміліся з рабочым, прадпрыемствам, вывучалі камуністычныя мэтады працы, што дало якасны творчы рост. Мы маем, хоць яшчэ вельмі мала, мастацкую прадукцыю з тэматыкай, пазнаўчы-інструкцыйнага пэрыяду, зрухі ў мастацкім пайсаньні героя пяцігодкі, творы, якія становяцца на шлях арганізацыі энтузіязму, пачуцьцяў, думак і волі рабочай клясы—за яшчэ большае разгортваньне тэмпаў працы, за змаганьне з клясавым ворагам.

Работа письменьніцкіх брыгад у Добрушы, у Гомелі, Віцебску, Бабруйску, у калгасах і саўгасах—ідэйна і творча ўзмацніла письменьніка. Клясавая барацьба на літаратурным фронце, у якой пралетарскія письменьнікі, пад кіраўніцтвам партыі, атрымліваюць перамогі, гартуе ў іх яшчэ большую стойкасьць за генэральную лінію партыі. І СЁНЬНЯ МенАПП, ЯГО АСНОЎНЫ АТРАД—МенАПП, ІДЭЙНА І ТВОРЧА СТАНОВЯЦЦА ВЯДУЧЫМ АТРАДАМ УСІХ ЛІТАРАТУРНЫХ СІЛ БССР. ЗАКЛІК РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ У ЛІТАРАТУРУ.

У справе закліку рабочых-ударнікаў у літаратуру МенАПП ня можа падрэсьліць асаблівага дасягненьня. Аднак гэта важнейшая палітычная задача ў Менску не правалена. Ва ўсіх буйнейшых прадпрыемствах створаны літгурткі. Звыш двух соцень рабочых-ударнікаў працуюць у літгурткох, шчыльна падыходзяць да пралетарскага літаратурнага руху. На сёнешні дзень мы ўжо маем першую творчую прадукцыю рабочых-ударнікаў (апавяданьні, вершы, нарысы), якая паказвае героіку сацбудаўніцтва. Здан у друк альманах творчасьці ударнікаў, у якім прымаюць удзел дваццаць аўтараў-рабочых.

Усё-ж у патрэбнай меры заклік рабочых-ударнікаў яшчэ не разгорнут. На жаль, нашы прафсаюзныя арганізацыі нічога ня робяць у гэтай арганічна зьвязанай з імі справе. Менская гарадзкая камсамольская арганізацыя за апошні час аддае вялікую ўвагу закліку ў літаратуру ажыцьцяўляючы, падпісаную паміж Гаркомам ЛКСМБ і МенАПП'ам, сацыялістычную ўмову.

Не заўсёды рабочыя-літгурткоўцы забясьпечаны часам і памяшканьнем для творчых заняткаў. Трэба памятаць, што «ЛІТАРАТУРНАЯ СПРАВА ПАВІННА СТАЦЬ ЧАСТКАЙ АГУЛЬНА-ПРАЛЕТАРСКАЙ СПРАВЫ» (Ленін).

Толькі з удзелам усёй пралетарскай грамадзкасьці, зьнішчыўшы маўчанку нашага друку па пытаньнях літаратуры, пад кіраўніцтвам партыі, пралетарская літаратура пікэідуе прарывы ў пытаньні арабоўваньня літфронту, у пытаньні бальшавізацыі літаратуры.

КАНФЭРЭНЦЫЯ МенАПП'у

Сутнасьць пралетарскага літаратурнага руху выяўляецца ў тым, што гэты рух павінен быць масавым. Наша асацыяцыя ўсю сваю работу на гэтым рэйкі рашуча пераключае. Канфэрэнцыя Менскай Асацыяцыі Пралетарскіх Письменьнікаў, што склікаецца 25 лістапада, павінна прайсьці пад знакам удзелу ў яе рабоце шырокай пралетарскай грамадзкасьці, у барацьбе за хутчэйшае заваяваньне гегемоніі пралетарскай літаратуры.

Што зроблена МенАПП'ам, каб канфэрэнцыя была масавай, каб прыцягнуць да літаратурнага руху шырокія копы рабочых?

Адным з важнейшых нашых мерапрыемстваў зьяўляецца, адкрытая у дні XIV гадавіны Кастрычніка, выстаўка МенАПП'у. Выстаўка сьведчыць аб вялікім ідэйным і творчым росьце письменьнікаў.

Ячэйка ЛКСМБ письменьнікаў абвясьціла сябе мабілізаванай на падрыхтоўку і ўдзел у працы канфэрэнцыі, вынаходзіўшы рад канкрэтных мерапрыемстваў. МенАПП выдае спэцыяльную друкаваную літаратурную газэту —аднадненку і, разам з Белдзяржкіно, —літаратурную кіно-газэту. МенАПП, Менгарпрафсавет, Менгарком ЛКСМБ выдаюць спэцыяльную адозву да ўсіх заводзкіх партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый з мэтай далейшага разгортваньня закліку рабочых-ударнікаў у літаратуру. Да канфэрэнцыі МенАПП наладжвае масавыя вечары (творчыя справаздачы) для рабочых сталіцы. 11-га лістапада Менгарком ЛКСМБ сумесна з МенАПП'ам правялі ў выторчых камсамольскіх ячэйках «ДЗЕНЬ ЛІТАРАТУРЫ». Гэтае важнейшае масава-палітычнае мерапрыемства, на жаль, не ва ўсіх ячэйках ЛКСМБ было належна ацэнена. Некаторыя ячэйкі нават не падрыхтаваліся.

Сакратарыят МенАП'у ухваліў правесьці дэкаду масавай падрыхтоўкі да канфэрэнцыі.

Аднак, з усёй патрэбнай работай, МенАПП без належнай дапамогі ня справіцца. Мы вітаем пачынаньне камсамольскага калектыву друкарні імя Сталіна аб прыняцьці шэфства над выданьнем да канфэрэнцыі альманаху творчасьці рабочых-ударнікаў.

Мы лічым патрэбным да канфэрэнцыі правесьці праверку ўсіх заводзкіх бібліятэк, выкінуць варожую літаратуру і папоўніць творамі пралетарскіх письменьнікаў. Мы лічым патрэбным, каб усе бібліятэкі Менску ў часе канфэрэнцыі наладзілі спэцыяльныя вітрыны пралетарскай літаратуры з анатацыямі да кожнай кнігі прыцягнуўшы да гэтай працы кніжны калектар ЦСПСБ.

Мы лічым неабходным, каб нашы газэты арганізоўвалі ўвагу пралетарскай грамадзкасьці вакол задач пралетарскай літаратуры, узялі пад свой кантроль працу па падрыхтоўцы да канфэрэнцыі, правялі праверку кіраўніцтва заводзкімі партколектывамі літаратурнымі гурткамі, прынялі актыўны ўдзел у працы канфэрэнцыі.

Мы просім Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі выдаць да канфэрэнцыі творы пралетарскіх письменьнікаў, зборнікі, якіх знаходзяцца ў друку.

Зусім у баку стаяць ад падрыхтоўкі да канфэрэнцыі нашы навуковыя і навучальныя ўстановы. Мы лічым, што Акадэмія Навук можа і павінна выпушчыць брыгаду марксыстаў для ўключэньня ў сэкцыю крытыкі МенАПП'у Даўно пара зьнішчыць разрыў паміж дасьледчыкамі літаратуразнаўцамі і практыкай пралетарскага літаратурнага руху. Дзяйна павінна рэктавацца да канфэрэнцыі нашы навучальныя ўстановы ў, у першую чаргу тыя, дзе рыхтуюцца выкладчыкі літаратуры ў мастацтва. Пытаньням сумежных з літаратурай мастацтваў на канфэрэнцыі будзе аддана вялікая ўвага, а гэта значыць, што працаўнікі тэатру, выяўленчага мастацтва, кіно, музыкі павінны прыйсьці на канфэрэнцыю падрыхтаванымі, каб узброенымі ўключыцца ў паход за вялікае мастацтва бальшавізму.

Справа літаратуры—справа рабочай клясы. На канфэрэнцыі рабочыя Менску павінны ПРАД'ЯВІЦЬ РАХУНАК пралетарскай літаратуры, якая пры ўсіх сваіх заваяваньнях АДСТАЕ яшчэ ад разгорнутых тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, і выпучыць з сваіх гераічных радоў пешых ударнікаў на фронт пралетарскай літаратуры.

ПРА ІНШЫЯ ЛІТАБ'ЯДНАНЬНІ.

Перш за ўсё мы абавязаны гаварыць пра Беларускае Літаратурнае Аб'яднаньне Чырвонай Арміі і Флёту (БелЛАЧАФ). Даводзіць асаблівае палітычнае значэньне неабходнасьці разгортваньня працы БелЛАЧАФ'у ня прыходзіцца. Праблема абароны краіны —адна з цэнтральных праблем. Аднак, БелЛАЧАФ працуе слаба. Нельга задаволіцца выпускам аднае кніжачкі (6 месяцаў таму назад) і ў вайсковым сэктары ДВБ некалькі перакладных кніжачак. Усе магчымасьці для пераўтварэньня БелЛАЧАФ'у ў масавую арганізацыю ў нас ёсьць.

Трэба разгарнуць сетку літгурткоў у вайсковых часьцях, наладзіць кансультацыю для пачынаючых письменьнікаў. Чырвонаармейцаў, правесьці адпаведную работу сярод письменьнікаў БССР аб неабходнасьці напісаньня мастацкіх твораў на вайсковую тэматыку. Зусім мала займаецца гэтым пытаньнем газэта «Чырвонаармейская праўда». Узварушыцца і паставіць работу БелЛАЧАФ'у на належную палітычную вышыню — задача ўсёй пралетарскай літаратурнай грамадзкасьці.

Зусім адсутнічае праца ў літаратурным Аб'яднаньні пралетарска-калгасных письменьнікаў. Аб'яднаньне створана даўно і ніякай адзнакі жыцьця, арганізацыйнай паваротлівасьці мы не адчуваем. А кожны дзень у рэдакцыі газэт, часопісяў, ДВБ, асобным письменьнікам пошта прыносіць творчасьць калгасьнікаў з усіх куткоў БССР. І амаль ніхто не дае адказу, парады, падтрыманьня ў творчай працы ўдарнікаў-калгасьнікаў, сярод якіх ёсьць, бязумоўна, таленавітыя таварышы.

Калі мы гаворым, што работа БелЛАЧАФ'у нездавальняючая, аднак ім праводзілася праца ў часе лягернага збору, на манэўрах, мэацца некалькі літгурткоў у вайсковых часьцях, дык Аб'яднаньне пралетарска - калгасных письменьнікаў ня мае ў калгасах БССР а ні воднага гуртка. Праўленьне Аб'яднаньня бязьдзейнічае. Ёсьць сродкі, ёсьць рэдкалегія, якая

Падрыхтоўка правакацыйнага выступленьня супроць СССР

Японская ваеншчына арганізоўвае бандыцкія налёты на савецкіх работнікаў

Паказаньні японскага агента—белагвардзейца Ушакова

Белагвардзейскія банды—для дывэрсыйнай работы на КУЧ

БЭЙПІН, 13. Атрыманы весткі аб далейшай правакацыйнай дзейнасьці японскай ваеншчыны ў Манчжурыі. На станцыі Манчжурыя кітайскай уладай арыштаваны прыбыўшы туды з Харбіну белагвардзеец Ушакоў, паказаньні якога і знойдзеныя пры ім дакументы даюць новыя до[illegible] японскімі элементамі і белагвардзейцамі рыхтуецьленьне супроць СССР. У белагвардзейца Ушакова [illegible]т Харбінскай японскай ваеннай місіі на адрас[illegible] на станцыі Манчжурыя—Уеда.

Ушакоў паказаў, што ён зьяўляецца членам «Харбінскай актыўнай [illegible]ва», якая зьвязана з японскай ваеннай місіяй у [illegible] пражываючыя ў Харбіне белагвардзейцы Круканоў [illegible]ыкаў. Белагвардзейскія групы, паводле паказаньняў Ушакова, пасланы [illegible]цыкар, Хайляр і Манчжурыю для дывэрсыйных актаў на К.-Усх. чыг. супроць савецкіх работнікаў і для сувязі з мангольскімі бандыцкімі элементар, якія падрыхтоўваюць па загадзе выпрацаваным пляне паўстаньне [illegible]зарзе (Манголін) пад выглядам «руху за н[illegible]залежнасьць».

У мясцовых колах арышт Ушакова выклікаў сэнсацыю. Чакаюць афіцыяльнага апублікаваньня кітайцамі паказаньняў Ушакова і захваченых [illegible] дакумантаў (ТАСС).

Трохгадзінны бой у раёне Дасіна

ТОКІЁ, 13. Як падае спэцыяльны карэспандэнт «Асахі» з Дасіна, Хэйлунцьзянская армія (армія генэрала Ма) працягвае нібы варожыя дзеяньні, абстрэльваючы японскія самалёты. З прычыны гэтага японскае войска 13 лістапада перайшло ў контр-атаку супроць левага флянгу хэйлунцьзянскіх войск і заняло раён за шэсьць міль на паўночны ўсход ад Дасіна. Бой цягнуўся тры гадзіны. Спэцыяльны карэспандэнт «Ніцы-Ніцы», паўтараючы гэтыя весткі, дадае, што «гутаркі ідзе аб дробных баёх, што сапраўдныя баі яшчэ не пачаліся». (ТАСС).

Правакацыйная хлусьня акупантаў

МУКДЭН, 12. Прадстаўнік японскай ваеннай улады ў Мукдэне зрабіў сёньня вечарам наступную афіцыяльную заяву:

«Чжан Сюэ-лян па ініцыятыве генэрала Ма аддаў загад Хэйлунцьзянскай арміі падрыхтавацца да рашучых баёў супроць японскіх войск. Чырвоныя партызаны ў складзе каля 300 кітайскіх і карэйскіх камуністаў з Благавешчанску і 200 з раёну Верхняга Амура наступаюць у паўднёвым напрамку.

6 лістапада каля 12 вагонаў з грузам баявых прыпасаў і зброі прыбылі з Захаду на станцыю Ананьцзы. 8-га прыбыло яшчэ 5 вагонаў з такім-жа грузам. Атульная колькасьць кітайскіх войск, сканцэнтраваных на адным толькі фронце Ананьцзы, уключаючы вышэй памянёных чырвоных партызан, перавышае 20.000 чалавек. Сёньня раніцай наглядаецца актыўнасьць гэтых вайсковых часьцей. Часьць кітайскай кавалерыі, якая ідзе праз усходнюю частку Дасінскай акругі, паводле атрыманых вестак, ужо дайшла да гораду Флані ў тыле японскіх пазыцый, абышоўшы іх з флянгу. Становішча набывае патражаючы характар. З мінуты на мінуту чакаецца пераход кітайцаў у наступленьне».

Заўвага ТАСС. ТАСС'ам атрымана з аўтарытэтных колаў паведамленьне, што калі падобная заява была сапраўды зроблена прадстаўніком японскай улады ў Мукдэне, дык яна ад пачатку да канца зьяўляецца правакацыйнай хлусьнёй, якая ня мае пад сабой ніякай падставы. Недарэчны вымысел аб якіхсьці «чырвоных кітайскіх партызанах» і карэйскіх камуністах, што нібы наступаюць з Благавешчанску і Верхняга Амура, і аб падвозе зброі і баявых прыпасаў можа тлумачыцца толькі імкненьнем авантурнікаў адвесьці ўвагу грамадзкай думкі ў бок ад іх уласных дзеяньняў.

Японія ня пойдзе ні на які кампраміс

ТОКІЁ, 13. Прадстаўнік міністэрства замежных спраў сёньня заявіў, што Японія не згодзіцца ні на якія кампрамісы на сэсіі Лігі Нацый. Прыблизце пяці пунктаў — абазвякова. Ад гэтага Японія не адступіцца. Пры наступных непасрэдных перагаворах паміж Кітаем і Японіяй дагавор 1915 году павінен быць прызнаны».

Ультыматум камандуючага японскай арміяй

БЭЙПІН, 13. Генэрал Хондзіё (камандуючы акупацыйнай японскай арміяй) прад'явіў Цыцыкарскай уладзе наступны ультыматум:

«Прапаную Ма выйсьці ў адстаўку. Цыцыкарскае войска павінна безадкладна эвакуявацца з Цыцыкару і станцыі Ананьцзы, якая ў мэтах захаваньня спакою на Таонаньскай чыгунцы будзе безадкладна занята японскімі войскамі. Адказ павінен быць дан не пазьней 24 гадзін 12 лістапада».

У мясцовай кітайскай газэце, якая выходзіць у Цыцыкары, 13 лістапада апублікавана адозва Ма, у якой пералічваюцца факты японскіх гвалтаў і захватніцтва, падкрэсьліваецца абаронны характар дзеяньняў цыцыкарскай улады і ранэйшае іх змагацца супроць інтэрвэнтаў (ТАСС).

Ціжкая артылерыя пушчана у ход

БЭЙПІН, 14. На працягу вчарашняга [illegible] у сакратарыят Лігі нацый зноў паступіла некалькі дыплёматычных нот [illegible]ая і Японіі.

Японскі міністар замежных спраў Сі[illegible] заявіле ў сваёй ноце, што япон[illegible]е войска, што знаходзяцца ля маста [illegible]раце Ноні, атрымала загад не пашы[illegible] ваенных апэрацый да таго, часу, [illegible]куль «значна больш моцнае кітай[illegible]е войска не пачне варожых дзеянь[illegible]. Адмена закранутага Брынкам [illegible] насьлы «нейтральных [illegible]» у Кітай, японская но[illegible] што «прадстаўніком дзяр[illegible] [illegible]ходзяць у склад рады і [illegible], ужо з самага пачатку прада[illegible]дзена магчымасьць наглядальня».

Адначасова кітайская нота паведамляе аб падрабязнасьцях японскага ўльтыматуму, перададзенага маёрам Хаясі генэралу Ма. Кітайская нота паведамляе аб далейшых баёх. Японскае войска, якое асадзіла прадмостнае ўмацаваньне, атрымала падмацаваньне з двух батарэй цяжкой артылерыі. Японская кавалерыя і артылерыя ўступілі ў бой з кітайскай артылерыяй. Бой працягваецца.

Кітайская нота канстатуе, што японская армія пачала ваенныя дзеяньні без фармальнага абвяшчэньня вайны. Кітайскі ўрад другі раз патрабуе пасыл кі онэйтральных наглядальнікаў, якія магчыма кантраляваць уход японскіх войск з Манчжурыі.

Абстрэл японцамі ваенных прадстаўнікоў

БЭЙПІН, 13. З Харбіну паведамляюць, што аўтамабілі, у якіх ехалі ангельскі і амэрыканскі ваенныя прадстаўнікі, былі на Цыцыкарскім фронце абстрэлены японскімі войскамі, пасьля чаго гэтыя прадстаўнікі вярнуліся ў Харбін.

Новыя японскія палкі—у Манчжурыю

ТОКІЁ, 13. Паводле вестак 14 лістапада пачнецца адпраўка ў Манчжурыю праз Дайрэн наступных вайсковых часьцей: мешанай брыгады, складзенай з двух пяхотных палкоў, аднаго кавалерыйскага палка, корпуса палявой артылерыі, а таксама аднаго авіяцыйнага, тэлеграфнага, аўтамабільнага і санітарнага атрадаў.

Патрабаваньні японскай ваеншчыны

ТОКІЁ, 14. Прадстаўнік міністэрства замежных спраў 14 лістапада раніцою заявіў, што японскі ўрад 13 лістапада ўпаўнаважыў Хандзіо «ўмацніць перагаворы» з генэралам Ма на наступных падставах:

Па-першае, генэрал Ма павінен адвесьці хейлунцьзянскія войскі да Цыцыкара. Войскі, скансэнтраваныя ў даны момант ля Ананьцзы і таксама ля Цыцыкара павінны быць адведзены ў месца сваёй звычайнай гарнізоннай службы.

Па-другое войскі генэрала Ма не павінны зьяўляцца ў раёне па поўдзень ад лініі КУЧ.

Па-трэцяе, кіраўніцтва Таонань-Ананьцзы чыгункай павінна быць пад кам перадана ў рукі праўленьня, якое знаходзіцца ў Таонані (на чале праўленьня стаіць японскі дарадца Фізавара). Войскі Ма ня ўмешваюцца ў кіраўніцтва чыгункай, у выпадку-ж, калі яны будуць рабіць перашкоды, японскія войскі прымуць энэргічныя меры.

Па-чацьвертае, генэрал Ма павінен ажыцьцявіць гэтыя ўмовы па працягу 10 дзён, пачынаючы з 15 лістапада.

Пятае. Японскія войскі ў раёне ракі Ноні эвакуюцца ў Таонань або Чжэцьзятунь, калі камандваньне ўстановіць, што генэрал Ма належным чынам выканаў паказаньні патрабаваньні. (ТАСС).

Заборона кампартыі Канады

ТЮ-ЕРК, 13. Судовы працэс супроць кіруючых работнікаў канадзкай кампартыі, які адбываўся ў Таронта, скончыўся. 8 абвінавачаных, паводле заключэньня прысяжных прызнаны вінаватымі [illegible] контрзаконнай арганізацыі [illegible] сваёй мэтай [illegible]ыбуктарэньне да паўстаньня». Пры[illegible]р будзе апублікаваны пазьней.

[illegible] пасьля заключэньня вер[illegible]к дзяржаў[illegible] Ранапову аб [illegible]ыкацыі масмасьці кампартыі Кана[illegible] і аб высылцы з краіны ўсіх яе чле[illegible], якія могуць быць высланы. Прапанова гэта будзе разгледжана судом у бліжэйшы час.

Судовы працэс у Таронта працягваўся 11 дзён. Будынак суда ахоўваўся ўзмоцненымі нарадамі паліцыі. Імёны асуджаных камуністаў: **Тым Бун** (сакратар [illegible] лігі прафсаюзнага адзьдства), **Мальконым Брус** (рэдактар органу кампартыі Канады). Дзевяты абвінавачаны Гаўінскі апраўдан з-за адсутнасьці выстарчальных доводаў.

Абвінавачае заключэньне прысяжных азначае **фактычную забарону кампартыі Канады.** (ТАСС).

Горшыя часы царызму ўваскрошаны ў фашысцкай Польшчы

Яўрэйскія пагромы ня спыняюцца

Варшава, 12. Польская прэса рапоўнена апісаньнямі яўрэйскіх пагромаў. У авангардзе пагромыкаў, якіх раней, ідзе фашысцкае студэнцтва. Пагромы з кожным дзём пашыраюцца. Ад масавага [illegible] студэнтаў [illegible] розных зброй [illegible] пагромаў яўрэйскіх [illegible]ватэр. Варшаве і ва ўсёй Польшчы. Са[illegible] за 11 [illegible] фашысцкае студэнцтва і дэкляс[illegible] [illegible] разгортваюць вакол [illegible] падзей у Вільні энэргічную агітацыю пад пагромнымі лёзунгамі.

З усяго відаць, што пагромы арганізаваны з благаславеньня кіруючых фашысцкіх колаў з выразнай мэтай аддягнуць увагу мас ад сапраўдных прычын крызісу і ад рэвалюцыйнай барацьбы мэтай расколу адзінства працоўных усіх нацыянальнасьцяй.

[illegible] ужо дружыны самаабароны, якія даюць адпор пагромшчыкам.

Сёньня цэнтральнае месца займаюць крывавыя падзеі ў Вільні, дзе ў часе пагрому 2 забіты і некалькі дзесяткаў паранены. Забіты два студэнты. Віленскі унівэрсытэт зачынены. Вільні фашысцкае студэнцтва разам з вулічнымі хуліганамі наладзіла пагромы яўрэйскіх [illegible]. Фашысцкае студэнцтва і дэкляс[illegible] [illegible] разгортваюць вакол [illegible] падзей у Вільні энэргічную агітацыю пад пагромнымі лёзунгамі.

[illegible]зьюшыліся, што **выкідаюць з [illegible]ысак яўрэйскіх дзяцей.**

У абарону яўрэйскіх студэнтаў [illegible]юды становіцца рэвалюцыйнае [illegible]прагрэсыўнае студэнцтва. Паліція ня прымае ніякіх мер для ліквідацыі пагромных выпадаў, займаючыся толькі арыштамі рэвалюцыйных студэнтаў. У рабочых [illegible]арталах Варшавы ствараюцца [illegible]

Пранёс 37 сялян у Заходняй Украіне

Поўны правал судовага фарсу

[illegible] «Работнік» ад 13 [illegible] аб надзвычай [illegible] які адбыўся [illegible] у **Замосьці** [illegible]ахоўная Украіна). На лаве падсудных сядзела 37 сялян з **Паўлам Сурай на чале.** Справа прадстаўляецца ступным чынам:

Восеньню 1929 г. улада ліквідавала рэвітут (зямля супольная з памешчыкам) **вёскі Дашкевічы, Замойскага пату,** разам з засеянным збожжам **на рыцыць памешчыка.** Занест гэтага [illegible]яно атрымлівалі права пасьвіць [illegible]цла ў лесе памешчыка да канца збо[illegible]ўраджаю 1930 г.

Аднак, памешчык, ня гледзячы на [illegible]га, сялянам пасьвіць быцла ў сваіх [illegible]сах не дазволіў. Панскія лясьнікі [illegible]ным грубым чынам выганялі з лесу [illegible]лянскае быцла, стралялі яго, зьбівалі [illegible] паступкоў.

[illegible] аціць ура[illegible] гэтую справу [illegible] памешчык [illegible] сабраць [illegible] пану зямель. [illegible] уся вёска [illegible] салідарна выйшла на палоткі, пачала жаць засеянае імі жыта, прызначанае памешчыку.

Кіраўнік маёнтку **Грабкоўскі** выклікаў паліцыю. Паліцыя зараз-жа прыехала **«абараняць»** памешчыка, накінуўшыся на сялян, б'ючы іх і палохаючы турмой. Абураныя сяляне далі паліцыі дружны адпор і яна прымушана была ўцякаць з поля.

Скора на месца падзей былі выкліканы новыя атрады пешай і коннай паліцыі. Некалькі дзесяткаў сялян былі арыштаваны. Арыштаваных, пасьля жудасных катаваньняў у дэфэнзыве, кінулі ў турму. Дэфэнзыва **цэлы год** фабрыкавала справу.

І што-ж? Адбыўся на днях працэс. Ня гледзячы на гадавую «працу» дэфэнзывы, нават фашысцкі суд **прымушан быў** апраўдаць усіх падсудных. Судовы фарс, да якога так старанна рыхтавалася дэфэнзыва, пацярпеў самы ганебны **правал.**

Гэты працэс — адзін з тысячных прыкладаў таго, як фабрыкуюцца палітычныя працэсы ў белапанскай Польшчы.

ПА СССР І БССР

4-я усебеларуская мастацкая выстаўка

8-га лістапада ў доме Асьветы і клюбе навуковых працаўнікоў адкрылася 4-я ўсебеларуская мастацкая выстаўка, [illegible] месяца.

Выстаўка прысьвечана 14-й гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі і трэцяму рашаючаму году пяцігодкі.

Урачыстае адкрыцьцё адбылося сумесна з рабочымі галянтэрэйнай фабрыкі, пісьменьнікамі і прадстаўнікамі грамадзкіх арганізацый.

Той факт, што гэта выстаўка прысьвечана трэцяму рашаючаму году пяцігодкі і адкрылася ў дні Кастрычніцкіх сьвят, пры ўдзеле пралетарскай грамадзкасьці, сьведчыць аб зруху асноўных мас мастакоў у бок удзелу ў сацыялістычным будаўніцтве, аб іх жаданьні прысьці насустрач запатрабаваньням шырокіх працоўных мас.

Сёлетняя выстаўка рэзка адрозьніваецца ад усіх папярэдніх. Калі на былых выстаўках былі прадстаўлены беспрадметныя натюморты, краявіды, прыклады фармалістычнага экспэрымэнтатарства і нацыянал-дэмакратычных тэндэнцый, то на апошняй мы ўпершыню бачым першыя спробы савецкіх мастакоў стаць на шлях актыўнага ўдзелу ў нашай гераічнай рэчаіснасьці.

Цэлы рад выстаўленых прац паказвае працэсы індустрыялізацыі і калектывізацыі, партэты ўдарнікаў і імкненьне перадаць героику і энтузіязм сацыялістычнага будаўніцтва.

На фоне працмастакоў, уже вядомых пралетарскай грамадзкасьці БССР, значнае месца займаюць **малодыя мастацкія надры,** працы якіх прапануць актыўным жаданьнем падыйсьці шчыльна да задач сучаснасьці.

Трэба каб шырокая пралетарская грамадзкасьць зацікавілася 4-й выстаўкай, аддала ёй **максымум увагі і прыняла** актыўны ўдзел у крытыцы, якая павінна паслужыць стымулам да распрацоўкі праблемы творчага метаду пралетарскага мастацтва.

Толькі шляхам удзелу шырокіх працоўных мас, толькі разгорнутай пралетарскай крытыкай навядзі творчасьці нашых мастакоў магчыма дабіцца кансалідацыі пралетарскіх сіл на фронце абмеркаваньня мастацтва і стварэньня розна-стайных форм вялікага мастацтва бальшавізму.

Т. ВЫХОДЦАЎ.



Тав. МІРЗАЕЎ — брыгадзір інструментальнай брыгады — перайшоў з брыгадай на гаспадарчы разрахунак.

Пэршая савецкая разьлівачная машына—вышэйшае дасягненьне сусьветнай тэхнікі

ХАРКАЎ. На мэталюргічным заводзе імя Рыкава выпушчана першая савецкая разьлівачная машына.

Машына была пабудавана і адана ў эксплёатацыю за 40 дзён, тады як мантаж і ўстаноўка такой-жа імпартнай машыны на іншых заводах працягвалася каля 6-ці месяцаў.

РАЗЬЛІВАЧНЫЯ МАШЫНЫ—ВЫШЭЙШАЕ ДАСЯГНЕНЬНЕ СУСЬВЕТНАЙ ТЭХНІКІ. Яна мэханізуе ўсю работу па ўборцы чыгуну, пікэідуе ліцейныя двары доменных печаў і пікэідуе найбольш дэфіцытныя спэцыяльнасьці рабочых.

Больш 3.600 дэталяй для дзьвюх разьлівачных істужак машыны трэба было адліць і тэрмічна апрацаваць з спэцыяльнай сталі, якая звычайна выраблялася толькі ў электрапечах. Гэта трудносьць здавалася непераможнай, бо на заводзе могуль ніякія адказныя машынныя дэталі ніколі не выраблялі. Спэцыяльная (гадфільдаўская) сталь была атрымана спосабам, які ўпяршыню ў сьвеце быў ужыты для такой адказнай плаўкі.

ДА 20 КАСТРЫЧНІКА РАЗЬЛІВАЧНАЯ МАШЫНА БЫЛА ГАТОВА НА ПРАЦЯГУ ПЕРШЫХ 10 ДЗЁН МАШЫНА НА ПОЎНАЙ НАГРУЗЦЫ ПАКАЗАЛА ВЫШЭЙШУЮ ЯКАСЬЦЬ РАБОТЫ, ЯКАЯ НІЧЫМ НЯ ЎСТУПАЕ ІМПАРТНАЙ МАШЫНЕ.

У даны момант па машыны па разьлёўцы чыгуну занята ў суткі 45 чалавек, у той час, як раней на разьлёўцы працавала 210-220 чалавек чыгуначыкаў, фармаўшчыкоў і грэбчыкаў. У РЭЗУЛЬТАЦЕ ЗАСТАСАВАНЬНЯ НА ЗАВОДЗЕ ІМЯ РЫКАВА САВЕЦКАЙ РАЗЬЛІВАЧНАЙ МАШЫНЫ САБЕКОШТ РАЗЬЛІЎКІ АДНЭЙ ТОНЫ ЧЫГУНУ ЗНІЗІЎСЯ З 4 РУБ. 10 КАП. ДА 1 Р. 50 КАП.

Арганізован дзяржаўны вучоны савет

Савет Народных Камісараў БССР пастанавіў арганізаваць у складзе Наркамасьветы БССР дзяржаўны вучоны савет. Апошні вызначае пытаньнем устанаўленьня адзінага праграмна-мэтальчнага і мэталалёгічнага кіраўніцтва навучальнымі і асьветнымі ўстановамі. Пастановы дзяржаўнага вучонага савету абавязковы для ўсіх навучальных устаноў і для ўсіх арганізацый, пад ведамам якіх навучальныя ўстановы знаходзяцца.

Пастанова № 48

Народнага Камісарыяту Працы БССР ад 9 лістапада 1931 г.

„Пра зварот на работу па спэцыяльнасьці спэцыялістаў, якія скончылі навучальныя ўстановы і працуюць не па спэцыяльнасьці“

У адпаведнасьці з пастановай НК РСІ і прэзыдыуму ЦКСВ ад 21/X—31 г. «Аб умовах працы інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу» (газ. «Рабочий» № 257 ад 31/X—31 г.), Наркампрацы БССР пастанаўляе:

1. Адкамандіраваць для работы па спэцыяльнасьці спэцыялістаў, якія скончылі ВНУ, ВТНУ і тэхнікумы не раней 1 мая 1929 г. і якія ў сучасны момант працуюць не па спэцыяльнасьці атрымаўшы ў навучальнай установе.

2. Адкамандіраванню падлягаюць усе спэцыялісты (інжынэрна-тэхнічныя, агранамічныя, ветэрынарныя і іншыя работнікі), якія зьяўляюцца ці маюць права быць членамі ІТР незалежна ад таго: а) ці скончыў ён навучальную ўстанову БССР, ці іншай Саюзнай рэспублікі; б) ці быў заангажаваны якой-небудзь гаспадарчай арганізацыяй.

Увага: 1) Не падлягаюць адкамандіраванню тыя спэцыялісты, якія займаюць выбарныя пасады ў савецкіх, партыйных і прафсаюзных арганізацыях.

2) Гэта пастанова не пашыраецца на асоб, скончыўшых мэдычныя, педагагічныя і прававыя ВНУ.

3. Усе прадпрыемствы і ўстановы, якія знаходзяцца на тэрыторыі БССР, абавязаны ў дакладны тэрмін са дня апублікаваньня гэтай пастановы, падаць у органы працы свайго району сьпісы асоб, якія працуюць у іх і якія падлягаюць адкамандіраванню, паводле арт. 1 гэтай пастановы. У сьпісах паказваецца: а) назва і адрас прадпрыемства ці ўстановы; б) якому гаспадарчаму аб'яднаньню ці наркамату падпарадкавана; в) прозьвішча, імя і імя па бацьку спэцыяліста; г) год нараджэньня; д) партыйнасьць; е) якую навучальную ўстанову і калі скончыў; ж) дзе, калі і колькі часу і на якой пасадзе працаваў; з) хатні адрас спэцыяліста.

4. Пэрсанальны адбор і разьмеркаваньне на работу асоб, якія падлягаюць адкамандіраванню, робіцца камісіяй пры раённых ці гарадзкіх органаў працы ў складзе: прадстаўніка органу працы (старшыня камісіі), мясцовай гаспадарчай арганізацыі (на вызначэньні РВК і Гарсавету) і райпрафсавету (раённы ЦК).

Увага: Спрэчныя пытаньні, якія будуць узьнікаць у рабоце камісіі, перадаюцца на вырашэньне камісіі пры НКПБ.

5. У выпадку, калі спэцыялісты, які падлягае адкамандіраванню, ня можа быць скарыстаны ў раёне яго пражываньня, весткі аб такіх спэцыялістах павінны быць паведамлены ў НКПБ. Пэрсанальны адбор і разьмеркаваньне гэтых асоб робіцца камісіяй пры Наркампрацы БССР.

6. Асобы, якія атрымалі прызначэньне на работу, абавязаны не пазьней 5 дзён пасьля атрыманьня прадпісаньня, зьявіцца на месца прызначэньня. Прадпрыемствы і ўстановы абавязаны ў тойжа тэрмін вызваліць іх ад работы і ўтварыць з імі поўны разьлік (бяз выплаты выходнай дапамогі). Зарплата работнікам, якія спазьнілася зьявіліся на месца прызначэньня, выплачваецца са дня зваленьня з раней шага месца работы.

7. Уся работа па звароце паказаных у гэтай пастанове спэцыялістаў, павінна быць скончана не пазьней 1/XII 1931 г.

8. Адказнасьць за выкананьне гэтай пастановы ў тэрмін усклаецца на раённых і гарадзкіх інспэктараў працы і кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў.

9. Органы працы павінны не пазьней 1/XII—31 г. прадставіць у Наркампрацы БССР весткі аб колькасьці спэцыялістаў, вызваленых і накіраваных на работу па спэцыяльнасьці.

Нам. Наркампрацы БССР
ПУШЧЫН.

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Генэрал Ма абвяргае японскую хлусьню

ШАНХАЙ, 14. Генэрал Ма адправіў у Нанкін тэлеграму, у якой катэгарычна абвяргае паведамленьні, што пашыраюцца японцамі, нібы яму аказваецца падтрыманьне з боку СССР. Генэрал Ма заяўляе, што ў яго арміі няма ні аднаго савецкага вайсковага інструктара.

Масавае ўцяканьне працоўных Фінляндыі ў СССР

ГЕЛЬСІНГФОРС, 14. Фінляндзкі друк паведамляе, што перабежкі працоўных з пагранічных фінляндзкіх мясцовасьцяй у СССР набываюць усё больш буйныя разьмеры. Штодзённа ўцякаюць 20-30 чалавек.

Даць адпор шавіністычным выпадам

На курсах бухгальтараў сыстэмы Лесбелу (Менск) уся работа праводзіцца на расійскай мове. Большасьць выкладчыкаў, ня гледзячы на патрабаваньне слухачоў, катэгарычна адмаўляецца весьці работу на беларускай мове.

Гэтыя вялікадзяржаўніцкія тэндэнцыі знаходзяць падтрыманьне з боку пасобных слухачоў курсаў. Так, Кульчыцкі, Арцюховіч, Мялэчкоў катэгарычна адмаўляюцца слухаць лекцыі па палітэканоміі, якія выкладаюцца на беларускай мове. Гэтыя вялікадзяржаўніцкія падпявалы прымушаюць выкладчыка па некальні разоў паўтараць асобныя фармулёўкі і пераводзіць іх на расійскую мову з тэй прычыны, што нібы Кульчыцкі і К° не разумеюць беларускай мовы.

Пасобныя лекцыі ператвараюцца проста ў гадзіны дыскусій аб тым, на якой мове павінен чытаць лекцыю нават той выкладчык, які ўладае беларускай мовай. І самае горшае гэта тое, што ў рад дзе выпадкаў «бяруць верх» вялікадзяржаўнікі — лекцыі праводзіцца на расійскай мове.

Усё гэта адбываецца на вачох партыйнай і камсамольскай арганізацый. Аб гэтым, бязумоўна, ведаюць адказныя работнікі з Лесбелу і асабліва тыя, што кіруюць курсамі.

Парт'ячэйка Лесбелу павінна неадкладна заняцца праверкай усіх гэтых фактаў. Трэба ДАЦЬ АДПОР шавіністычным выпадам як з боку асобных выкладчыкаў, так і студэнтаў.

Неабходна ў рабоце курсаў забясьпечыць поўнае ажыцьцяўленьне ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай палітыкі і ў прыватнасьці ўсю работу курсаў праводзіць на беларускай мове.

Н. К.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

З прычыны пераходу рэдакцыі газэты „ЗЬВЯЗДА“ на пяціднеўку—перапынку, газэта ня будзе выходзіць 2, 7, 12, 17, 22, 27 кожнага месяца.

17 лістапада, у 11 гадз. раніцы, у памяшк. Наркампрацы

скліканецца нарада

па пытаньні аб ходзе забесьпячэньня дэсэнтрэтаваны раб. гук. сілай. арганізацыі працы і культурна-бытавога абслугоўваньня дэсарабочых.

На нараду запрашаюцца прадстаўнікі: НКА, НКАЗ, НК РСІ, ЦП саюзу дэсарабочых, БКС, Калгасцэнтр і прадстаўнікі газэт: „Зьвязда“, „Савецкая Беларусь“ і „Рабочий“. Акрамя гэтага павінны абавязкова зьявіцца прадстаўнікі: Белдэспром, Лесбел, Белдарэў, Леспрамгасы: Барысаўскі, Рэчыцкі, Бабруйскі і інспэктары працы: Барысаўскі, Рэчыцкі і Бабруйскі. Яўка без спазьненьня.

НАМ. НАРКАМПРАЦЫ БССР ПУШЧЫН.

Чырв. Зорка Пач. 6, 8-20.10-30	Гаварашчы гукавы фільм **ЗЛАТЫЯ ГОРЫ**
„КУЛЬТУРА“ Пач. 7, 8-45, 10-30	1) Вялікая бяда Невялікай квачыны 2) Электраэвод культурфільм
„Інтэрнацыянал“	Замежны фільм Нахабны і спорт ЗЬВІШ ПРАГРАМЫ: Буржуазьнінэ-хрэвалюцыі
ОРАЛЕЙ	Бустэр Кітон АПАНТАНЫ у фільме БАЛКАНЫ у 6 ч. у 2 ч. Зьвіш праграмы
„Юны Піянэр“ (будынак кіно „Культура“)	Арыгінальная нямэцкая „Два друга, модель и подруга“ Зьвіш праграмы—хроника Пач. 1 г., 2-30. Каса—ад 11 г. ран.
„СПАРТАК“ Каса адкрыта 5 г.	Выдатны фільм ЧАЛАВЕК З ЛЕСУ Драма ў 7 частках

Беларускаму аб'яднаньню „БЕЛУЦІЛЬ“ ПАТРЭБНЫ для работы ў Менску больш работнікі інжэнэрна-тэхнічнай кваліфікацыі: нам. галоўнага бухгальтара, або бухгальтар-інструктар, планавік-эканаміст, спэцыяліст па ўцілізацыі паўтарай шыфэлы, са спэцыяльнай адукацыяй, работнікі, якія добра ведаюць уцільную справу, два статыстыкі і адна машыністка, якая добра ведае беларускую мову. ОПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ. Праезд за кошт аб'яднаньня. Заявы з дакумэнтамі працоўных [illegible] сьпісаў або іншых дакумэнтаў [illegible] накіроўваць у сэктар кадраў аб'яднаньня [illegible]

Пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР

адбудзецца

15-га лістапада, у 7 гадз. вечара, у пам. ЦК МОПР'у

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Зацьвярджэньне фінпляну на 1932 г.
2. Выніні абсьледаваньня Койданаўскай і Вузьдзенскай арганізацый МОПР'у.
3. Аб ходзе рэалізацыі пазыкі.
4. Выніні папулярызацыі пастаноў 2-га пленуму ЦК МОПР'у СССР.
5. Аб месячніку мабілізацыі матэрыяльных сродкаў.

З прычыны важнасьці абгаварэньня пытаньняў, яўка ўсіх членаў і кандыдатаў прэзыдыуму і ЦК—абавязкова.

Просьба зьявіцца без спазьненьня.

Запрашаюцца ўсе члены і кандыдаты Менскага гарадзкога комітэту МОПР'у, а таксама актыўныя ячэйкі.

Сакратар ЦК МОПР'у БССР ЦУДЗІН.

ленья т-ва АЎТАДОР (Ленінская 23) прымае ў рамонт валёсыпэды, прымусы, грамафоны і інш. Выкананьне заказаў у самы кароткі тэрмін і па ўмераных цэнах.

Сёньня, 15 лістапада, у 6 гадз. вец., у фіз. аўдыторыі фізічнага корпусу БДУ адбудзецца пасяджэньне фіз.-матэм. асацыяцыі БАН. БУДУЦЬ ДАКЛАДЫ: Усьпенскі—Жыцьцё і праца Міхася Гарадзкі. Некрашэвіч—Паняці Эдысона.

УСЕ СТУДЭНТЫ, ПРЫНЯТЫЯ Ў ЭНЭРГЕТЫЧНЫ ІНСТЫТУТ у гэтым годзе, павінны зьявіцца ў інстытут на заняткі 15 лістапада. Прыяжджаць з пасьцельнымі прыладамі. Дырэкцыя.

Далоў чаргі — У КІНО — Чырвоная Зорка! Ад 13 лістапада АДКРЫВАЕЦЦА ПАПЯРЭДНІ ПРОДАЖ БІЛЕТАЎ на вячэрнія сэансы ад 1 гадз. дня ШТОДЗЕННА ДА ВЕДАМА ФАБЗЎПЯНСКІМАЎ Прымаюцца заяўкі на пасылку касіра непасрэдна на прадпрыемства для продажу білетаў у часе абедзен. перапынку на любы кіно-сэанс

Сёньня, 15 лістапада, у 6 гадз. вец., у [illegible] адкрываецца 3-я гарадзкая канфэрэнцыя Аўтадору. Ячэйкам аўтадору, якія не атрымалі мандатаў, прапануецца атрымаць у Аўтадоры, Савецкая, 82. Пасьлядоўнае францыі у 6 гадз. там-жа. Прэзыдыум.

Сы Менскай гарадзкой інспэкцыі Нарасьветы АДКРЫВАЮЦЦА 6 МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ па падрыхтоўцы дашкольных работнікаў. Заявы прымаюцца ад работніц, жонак рабочых, калгасьніц і служачых. Прымаюцца асобы, якія маюць асьвету за 5 груп сэмігодкі. Тэрмін падачы заяў да 20-XI-31 г. у памяшканьні Гарсавету (вул. Волі)—дашкольнаму інспэктару (пакой № 16).

1-га сьнежня канчаецца кампанія зімовай дапамогі. Да ведама ГК, РК і ячэек МОПР'у. Цэнтральны камітэт МОПР'у БССР напамінае ўсім арганізацыям і ячэйкам МОПР'у БССР, што кампанія зімовай дапамогі канчаецца 1 сьнежня і ніякіх адтэрміновак у гэтай кампаніі ня будзе. Усе сродкі, якія ёсьць па КЗД павінны быць да 1 сьнежня пераведзены ў ЦК МОПР'у БССР. ЦК МОПР'у БССР зварачаецца да ўсіх гаспадарнікаў і рахункавых працаўнікоў з просьбай перадачыць сумы, якія адлічаны рабочымі і служачымі па падпісных лістах, на агульных сходах і г. д. ГК, РК і ячэйкі, прымеце ўсе меры па выкананьні кантрольных заданьняў па КЗД. Сродкі, якія паступяць па КЗД пасьля 1 сьнежня, ня будуць залічацца ў ліч гэтай кампаніі, а будуць залічаны, як добраахвотныя ўзносы. ЦК МОПР'у БССР.

31 сьнежня 1931 г. пры станцыі Менск адкрываецца 2-месячныя КУРСЫ па падрыхтоўцы свотаяцеляў, оцэншчыкаў і отрэлачнікаў. Жадаючыя паступіць на гэтыя КУРСЫ могуць падаць заявы ў кантору начальніка станцыі Менск СЗ на працы тав. АЛЬХАВІНУ. Пры падачы заяў неабходна мець пры сябе пасьведчаньне або даведку ад сельсавету, калгасу ці саўгасу. Скончыўшыя гэтыя курсы маюць права заняць пасаду саставіцеля з акладам 110 р. 15 к., оцэншчыка—85 р. 83 к. і отрэлачніка з акладам 66 р. 40 к. Забесьпячэньне прадуктамі па лініі ТСТ, таксама праводзіцца водпуск дроў па цьвёрдых цэнах і выдача разавых білетаў на норме. СЗ на працы АЛЬХАВІН.

СЕНЬНЯ, 15 лістапада, у 7 гадз. вец., у аўдыторыі залі БАН (пр. Ленінскай і Унівэрсытэцкай вул.) АДБУДЗЕЦЦА сход т-ва марксыстаў дзяржаўнікаў. З ПАРАДКАМ ДНЯ: даклад т. Ранава на тэму „Да пытаньня аб мэтадалёгіі рацыяналізацыі кіраўніцтва“. Запрашаюцца работнікі Наркматэў і цэнтральных устаноў рацыяналізатары ўстаноў, савецкі актыў і студэнты інстытуту сав. будаўніцтва і права і аддз. сав. будаўніцтва Камвузу. Прэзыдыум.

23-X г. г. на ст. Гомель УКРАДЗЕН кашалёк з дакумэнтамі і разьлікам-наган.